Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

10 КРАСАВІКА 2015 г. ПЯТНІЦА № 68 (27926) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Калі спявае «Дубрава»

СТАР. 5

Праграма тэлебачання на тыдзень

20 КАНАЛАЎ

Прайсці па Губернатарскай, успомніць Багадзельную…

СТАР. 13

ЦЫТАТА ДНЯ

Людміла СТЭФАНОВІЧ,
намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення развіцця лічбавых банкаўскіх тэхналогій, начальнік упраўлення электронных плацежных інструментаў Нацыянальнага банка:

«Як вядома, увядзенне ліміту разлікаў наяўнымі ў 1000 базавых велічынь прадугледжана ўказам №493 «Аб развіцці безнаяўных разлікаў», які ўступіць у сілу з 19 красавіка. Беларусь пераходзіць на больш цывілізаваны ўзровень правядзення плацяжоў. У нашай краіне лімітуюцца наяўныя разлікі пры даволі буйных пакупках: 1000 базавых — гэта прыкладна Br180 млн, або каля $12 тысяч. У некаторых краінах ЕС, напрыклад, ліміт складае 2-3 тысячы еўра. Мы лічым, што ўкараненне ліміту разлікаў наяўнымі пройдзе беспраблемна: людзі паўсядзённа не ажыццяўляюць плацяжы ў буйных памерах. Праблем, нязручнасцяў з'явіцца не павінна. Хутчэй, наадварот: такім чынам грамадзяне змогуць звярнуць увагу, што разлічвацца за буйныя пакупкі ў безнаяўным парадку больш зручна і бяспечна, чым наяўнымі».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.04.2015 г.

Долар ЗША	14350,00	▼
Еўра	15420,00	▲
Рас. руб.	274,00	▲
Укр. грыўня	613,25	▼

ISSN 1990 - 763X

Распісное хараство

Рыхтаваць да Вялікадня пісанкі — упрыгожаныя і размаляваныя яйкі (драўляныя, шкляныя, сапраўдныя) — спрадвечная традыцыя. Ды і сёння якая гаспадыня адмовіцца аздобіць святочны стол такім вось хараством? Тым больш што сакрэты вырабу пісанак захаваліся і людзі, якія імі валодаюць, гатовыя падзяліцца імі з усімі ахвотнымі. Як, напрыклад, майстар мастацкага роспісу Святлана ШЧАРБАЧ з Уздзеншчыны. Яна была ўдзельніцай майстар-класа па вырабе пісанак, які наканадні свята па ініцыятыве Мінскага абласнога камітэта БРСМ наладзілі ў Стоўбцах умельцы з усёй вобласці. Гаспадыням было на што паглядзець і чаму павучыцца.

Фота Васіля ЯНЬКО.

■ Транспарт

ПАВЯЛІЧВАЦЬ ЦІ НЕ?

Штраф павінен быць дастаткова моцнай пагрозай для «зайцоў»

Такую думку карэспандэнту «Звязды» выказаў міністр транспарту і камунікацый Анатоль СІВАК. На пачатку года на выніковай калегіі Міністэрства транспарту і камунікацый у Оршы ў планах на 2015 год міністр агучваў перспектывы павышэння штрафаў за безбілетны праезд. «Мелася на ўвазе, што Мінтранс уносіць ініцыятыву для змяненняў у заканадаўстве (Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях) у 2015 годзе. Гэтае рашэнне павінна прайсці праз парламент», — удакладніў сітуацыю Анатоль Сівак.

ПРАБЛЕМА ЁСЦЬ

Значыць, рашэнне будзе прынята сёлета? «Не, гэта зусім не азначае, што рашэнне прымуць, — адказаў міністр. — Дэпутаты ў такіх сацыяльных пытаннях вельмі акуратна сябе паводзяць. Проста гэтая работа ўключана ў план. Сказаць, што гэта будзе напрыканцы 2015 года, нельга. Я бачу як міністр праблему: людзі не баяцца атрымаць штраф і таму не плацяць за праезд. Колькасць безбілетнікаў павялічваецца. І атрымліваецца, што, каб людзі плацілі, неабходна ўтрымліваць армію тых, хто гэтыя штрафы павінен са стапрацэнтнай гарантыяй збіраць. Як толькі зайшлі ў аўтобус без білета — значыць адразу штраф. А гэта вялікія выдаткі. Таму штраф павінен быць дастаткова моцнай пагрозай».

Нагадаем, што сёння штраф за безбілетны праезд складае 0,5 базавай велічыні (90 тысяч рублёў).

СТАР. 3

■ Надвор'е

ЛЕТА НА ВЯЛІКДЗЕНЬ

Сіноптыкі абяцаюць, што на выхадныя прыпячэ ажно да плюс 20 градусаў

Менавіта ў пятніцу на тэрыторыю Беларусі пачнуць паступаць цёплыя паветраныя масы з боку Заходняй Еўропы. І адразу пацяплее. Пра гэта паведаміла спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.

Пры павышаным фоне атмасфернага ціску ападкаў сёння не прагназуецца. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе 11-17 цяпла. У суботу нас чакае ўвогуле цёплае і сапраўды камфортнае надвор'е. Будзе выключна сонечна і амаль без ветру. Тэмпература паветра ўначы на суботу складзе 0-5 цяпла, а ўдзень — ужо плюс 15-20 градусаў. Даволі цёпла будзе і ў нядзелю, аднак атмасферныя франты з боку тэрыторыі Польшчы прынясуць месцамі па краіне кароткачасовы дождж. Стане часам ветрана, у асобных раёнах парывы ветру дасягнуць 15-18 м/с. Тэмпература паветра ўначы на нядзелю складзе 2-9 цяпла, а ўдзень — плюс 15-20 градусаў, аднак па паўночным захадзе стане халадней — толькі 12-14 цяпла.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, у панядзелак тэрыторыя краіны трапіць пад уплыў атмасферных франтоў з боку Балтыйскага мора. Таму ўначы месцамі, а ўдзень паўсюдна чакаюцца кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 0 да 7 цяпла, удзень — плюс 10-16 градусаў, а па поўдні краіны — да 18 цяпла. На жаль, у аўторак і сераду пахаладае. Часам будзе ісці дождж, а ў асобных раёнах — дождж з мокрым снегам. З'явіцца паўночна-заходні вецер парывамі да 15-18 м/с. Тэмпература паветра ўначы чакаецца ад мінус 3 да плюс 5 градусаў, удзень — 5-10 цяпла, а па поўдні да плюс 12-15 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ.

Падмурак закладзены

Наша краіна і Ірак дамовіліся пра выбудоўванне фундаменту супрацоўніцтва

Аб гэтым ішла размова на сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з міністрам замежных спраў Ірака Ібрагімам аль-Джафары, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што беларуска-іракскае супрацоўніцтва «мае добрую гісторыю». «Сённяшнія беларуска-іракскія адносіны характарызуюцца тым, што бакі празандзіравалі глебу для выбудоўвання далейшых сувязяў і цяпер можна выбудоўваць іх на перспектыву», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

«Зразумела адно: мы павінны выйсці на новы ўзровень супрацоўніцтва. Трэба выбудаваць сапраўдны фундамент адносінаў. Ім можа быць гандлёва-эканамічнае і ваенна-тэхнічнае супрацоўніцтва. Мы гатовы да выбудоўвання адносінаў па гэтых напрамках», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

На яго думку, перспектыўнай для двухбаковых кантактаў з'яўляецца і адукацыйная сфера. Цяпер ужо ў Беларусі навучаюцца іракскія студэнты, і магчыма пашырэнне ўзаемадзеяння ў гэтай сферы.

Як лічыць Аляксандр Лукашэнка, для стварэння асновы гандлёва-эканамічных адносінаў паміж Беларуссю і Іракам патрэбны канкрэтныя праекты, магчыма, для пачатку два-тры, у якіх неабходна развіваць далейшае супрацоўніцтва.

Кіраўнік беларускай дзяржавы таксама закрануў тэму стабільнасці сітуацыі ў Іраку. «Галоўны наш інтарэс у Іраку — гэта стабільны Ірак. Мы хочам, каб іракскі народ жыў стабільна ў дзяржаве, каб людзі адчувалі, што жывуць у сапраўды багатай дзяржаве і гэтыя багацці — здабытак іракскага народа», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

У сваю чаргу міністр замежных спраў Ірака падзякаваў беларускаму боку за аказаную яго краіне гуманітарную дапамогу. Ён высока ацаніў патэнцыял Беларусі ў галіне прамысловасці і выказаў зацікаўленасць у развіцці сувязяў з беларускай дзяржавай у гэтым напрамку, а таксама ў сельскай гаспадарцы і многіх іншых сферах. Усе гэтыя пытанні неабходна больш дэталёва разгледзець на пасяджэнні сумеснай камісіі па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве.

...

У межах рабочага візіту ў Беларусі Ібрагім аль-Джафары таксама сустрэўся са старшынёй Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаілам Мясніковічам. «Вядома, гэта ваш першы візіт у нашу краіну. Я думаю, што нашы сустрэчы будуць насіць рэгулярны характар», — выказаў надзею сенатар. Асобную ўвагу спікер верхняй палаты надаў не толькі эканамічным пытанням, але і заканадаўчым: «Беларускія парламентарыі будуць рабіць усё для таго, каб і гандлёва-эканамічныя, і гуманітарныя, і палітычныя кантакты паспяхова развіваліся». Міхаіл Мясніковіч запэўніў, што дэпутаты і сенатары зробяць усё магчымае, каб у іракскага боку не ўзнікала праблем з нарматыўна-дагаварной і прававой базай у нашай краіне, а заключаныя пагадненні паміж дзяржавамі не сутыкаліся з перашкодамі ў заканадаўстве. Акрамя таго, ён падкрэсліў, што Беларусь зацікаўлена «ў тым, каб Ірак быў моцнай і стабільнай дзяржавай».

Новыя схемы супрацоўніцтва

Беларусь прапануе Чувашыі развіваць супрацоўніцтва ў сферы пасажырскага транспарту. Пра гэта ўчора заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з кіраўніком Чувашскай Рэспублікі Міхаілам Ігнацьевым, паведамляе БЕЛТА.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што Беларусь разглядае Чувашыю як стабільнага гандлёва-эканамічнага партнёра. «Асноўныя напрамкі нашага ўзаемадзеяння — гэта вытворчая кааперацыя, агракомплекс, будаўнічая сфера, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Беларускія і чувашскія прадпрыемствы ўжо даўно завязаны ў адзіны вытворчы ланцуг. Аднак нам неабходна развіваць новыя напрамкі, ісці далей, ні ў якім выпадку не спыняцца на тым узроўні, які сёння ў нас існуе».

У Чувашыі добра ведаюць беларускую тэхніку: сельскагаспадарчую, будаўнічую, дарожна-будаўнічую, аўтамабільную. «Перспектыўным будзе наша супрацоўніцтва ў сферы пасажырскага транспарту», — выказаў упэўненасць Прэзідэнт. «Сёння чувашскія партнёры могуць набываць беларускую тэхніку па новых выгадных для спажыўца схемах», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Яшчэ адзін з напрамкаў двухбаковага супрацоўніцтва — сельская гаспадарка. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што размова тут ідзе не толькі аб простым набыцці тэхнікі і гэтак далей, але і аб навуцы, племянной справе, насенняводстве, селекцыі сельскагаспадарчых культур — пра тое, што забяспечвае агракомплексу ўстойлівае перспектыўнае развіццё.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што беларускія і чувашскія народы падобны працавітасцю, працаздольнасцю. На думку Прэзідэнта, гэта тая аснова, на якой бакі могуць рэалізаваць абсалютна любы праект.

Увага: завочная прамая лінія «Звязды»

УСЁ ПРА «ДАРМАЕДАЎ»

Кіраўніком дзяржавы прыняты Дэкрэт № 3 «Аб папярэджанні сацыяльнага ўтрыманства». Гэты дакумент прадугледжвае ўвядзенне спецыяльнага збору на фінансаванне дзяржвыдаткаў. Калі ў вас узніклі пытанні аб гэтым падатку, то існуе магчымасць атрымаць на іх адказы непасрэдна ад спецыялістаў падатковай галіны. Падрабязную кансультацыю па гэтай тэме на старонках газеты правядзе **начальнік галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асоб Міністэрства па падатках і зборах Беларусі Міхаіл РАСОЛЬКА.**

Папярэднія пытанні прымаюцца па тэлефоне: (8-017) 287-17-51, а таксама на электронны адрас (zviazda.by@gmail.com) на працягу бягучага тыдня.

ЗАЙМАЦЬ СВАЮ НІШУ

Рэгіянальныя СМІ павінны ствараць цікавы чытачам прадукт

Такое меркаванне выказала на выязным пасяджэнні калегіі Міністэрства інфармацыі па пытаннях дзейнасці рэгіянальных СМІ кіраўнік ведамства Лілія АНАНІЧ.

Фота БЕЛТА.

Па словах міністра, на старонках абласных, гарадскіх і раённых газет прадстаўлены самы шырокі зрэз жыцця рэгіёнаў. Праблемна-тэматычнае поле мясцовай прэсы ўключае ў сябе падзеі грамадска-палітычнага жыцця, развіццё эканомікі, культуры, сацыяльнай сферы, спорту, турызму (у тым ліку рэалізацыю дзяржаўных і рэгіянальных праграм), пытанні прапаганды здаровага ладу жыцця, бяспекі жыццядзейнасці, прафілактыкі і барацьбы са злачыннасцю, шэраг іншых тэм. Практычна ва ўсіх выданнях ёсць адпаведныя пастаянныя рубрыкі і тэматычныя старонкі.

«Але мала сёння даць толькі зрэз інфармацыі пра тое, што адбываецца ў раёне, гэтага недастаткова», — пераканана Лілія Ананіч. Паводле яе слоў, усе дзяржаўныя рэгіянальныя газеты сёння маюць свае сайты. Паказчыкам запатрабаванасці электронных версій выданняў з'яўляецца наведвальнасць рэсурсаў. У суткі адзначаецца ад 100 да 350 наведванняў. Геаграфія наведвальнасці досыць шырокая і выходзіць за межы рэспублікі.

Важным фактарам функцыянавання інтэрнэт-рэсурсаў з'яўляецца актуальнасць і абнаўляемасць матэрыялаў. Наогул, матэрыялы галоўных старонак сайтаў рэгіянальных газет абнаўляюцца дастаткова рэгулярна, ахопліваюць асноўныя пытанні жыцця абласцей, гарадоў і раёнаў краіны. Шэраг рэдакцый выкарыстоўваюць такія формы вывучэння меркавання аўдыторыі, як бліц-апытанні і галасаванні, якія знаходзяць жывы водгук у карыстальнікаў.

Разам з тым, неабходна ўдасканальваць дызайн-структуру сайтаў, сістэму ўнутраных рубрык, работу форумаў (у многіх сайтаў гэта адсутнічае), інтэграцыю з сацыяльнымі сеткамі і г.д.

Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар БУЗОЎСКІ, які браў удзел у рабоце выязнога пасяджэння калегіі, паведаміў, што наша краіна ў 2015 годзе завершыць пераход на лічбавае тэлевяшчанне. Ігар Бузоўскі ўпэўнены, што пераход не будзе стрэсавым, паколькі большая частка працы ўжо праведзена. У многіх раёнах ён ужо ажыццёўлены і тэлебачанне працуе ў лічбавым фармаце. Ігар Бузоўскі падкрэсліў, што развіццё СМІ ў сучасных умовах тычыцца і рэгіянальных сродкаў масавай інфармацыі. Рэгіянальныя газеты мяняюцца, мяняюцца падыходы да іх афармлення, тэматыка. Важна абмяркоўваць напрацаваны досвед рэспубліканскіх і рэгіянальных СМІ, каб выжываць у сур'ёзнай канкурэнцыі на інфармацыйным полі, дзе прысутнічаюць не толькі айчынныя СМІ.

Гаворачы пра работу рэгіянальных СМІ, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта адзначыў спецыфіку інфармацыі, якая там размяшчаецца, паколькі ў першую чаргу жыхароў рэгіёнаў цікавяць навіны вобласці, раёна, горада. «Але мясцовыя выданні не могуць абмяжоўвацца толькі гэтым: яны павінны выходзіць за межы рэгіёна», — дадаў ён.

Анатоль СЛАНЕЎСКІ.

■ Парламенцкі дзённік

ЗАКОН СУПРАЦЬ ХАБАРНІКАЎ ПРЫНЯТЫ Ў ПЕРШЫМ ЧЫТАННІ

У жніўні і верасні праходзіла грамадскае абмеркаванне праекта закона «Аб барацьбе з карупцыяй». Усе атрыманыя прапановы вывучаліся, аналізаваліся і менавіта з улікам іх быў падрыхтаваны канчатковы варыянт гэтага заканадаўчага дакумента. Учора дэпутаты прынялі праект закона «Аб барацьбе з карупцыяй» у першым чытанні.

Нагадаем, што дакумент быў распрацаваны Генеральнай пракуратурай сумесна з зацікаўленымі дзяржорганамі ў адпаведнасці з даручэннем Прэзідэнта краіны. Як адзначыў **Генеральны пракурор Аляксандр КАНЮК**, абмеркаванне праекта закона паказала: абсалютная большасць нашых грамадзян вельмі негатыўна ставіцца да карупцыі.

У дакуменце ўстаноўлена забарона на паўторны прыём на дзяржслужбу асоб, якія раней былі звольнены па дыскрэдытуючых абставінах. Законапраект таксама ўдасканальвае парадак дэкларавання даходаў і маёмасці асобных катэгорый дзяржаўных служачых для максімальна поўнага ўстанаўлення іх рэальнага маёмаснага становішча. Прапісана ўвядзенне механізма вяртання ў дзяржаўную казну незаконных даходаў, атрыманых дзяржслужачым.

МІЖНАРОДНЫЯ АБАВЯЗКІ ВЫКОНВАЕМ

Наша краіна ў 1999 годзе ратыфікавала Орхускую канвенцыю — аб доступе да інфармацыі, удзелу грамадства ў працэсе прыняцця рашэнняў і доступе да правасуддзя ў пытаннях, што тычацца навакольнага асяроддзя. Такім чынам, яна ўзяла на сябе і пэўныя абавязкі. Учора дэпутаты ў першым чытанні прынялі адпаведны праект закона, які ўносіць змены і дапаўненні ў некаторыя законы краіны па пытаннях аховы навакольнага асяроддзя.

Дэпутат **Ала НАВУМЧЫК, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы**, якая прадстаўляла гэты дакумент, паведаміла: праз прыняцце акта ў нацыянальнае заканадаўства будуць уключаны нормы Орхускай канвенцыі.

— Законапраект важны з той прычыны, што адным з найважнейшых стратэгічных кірункаў развіцця нашай краіны з'яўляецца зялёная эканоміка, — упэўнена дэпутат. — Акрамя таго, Беларусь заўсёды вельмі беражліва ставілася да навакольнага асяроддзя і надавала шмат увагі яго ахове. Магчыма, таму што мы на сабе адчулі наступствы чарнобыльскай катастрофы...

Як паведаміла парламентарый, у закон «Аб ахове навакольнага асяроддзя» ўводзяцца наступныя тэрміны: «уздзеянне на навакольнае асяроддзе», «грамадскія абмеркаванні праектаў экалагічна значных рашэнняў», «экалагічна значныя рашэнні».

— Сказаць, што гэты законапраект у нечым рэвалюцыйны, нельга, але, разам з тым, ён дае магчымасці грамадскасці вельмі актыўна ўдзельнічаць у прыняцці рашэнняў у сферы экалогіі, — адзначыла Ала Навумчык.

ПРАВА НА ПРАЦУ МАЮЦЬ УСЕ

У першым чытанні быў прыняты і праект закона «Аб знешняй працоўнай міграцыі». Як адзначыла **Ганна ЛЯВІЦКАЯ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах**, наша краіна сёння па сваім геаграфічным становішчы, па стабільным эканамічным, палітычным стане вельмі прывабная для замежнікаў, у тым ліку і для працоўных мігрантаў. Па словах дэпутата, сёння працоўная міграцыя вельмі змянілася: і якасна, і колькасна.

— Калі ў 2012 годзе да нас прыязджала каля 10 тысяч працоўных мігрантаў, то ў 2014 годзе — ужо 37 тысяч, — аргументавала парламентарый. — Што да працоўнай міграцыі ўвогуле, то найбольш да нас прыязджаюць з краін былога Савецкага Саюза — гэта Расія, Украіна... Натуральна, ёсць і грамадзяне Кітая. Працаўладкоўваюцца яны ў асноўным у галіне сельскай гаспадаркі, будаўнічай сферы і ў сферы высокіх тэхналогій.

Што да новага, якое ўводзіць законапраект, то гэта ў першую чаргу нормы, што пашыраюць магчымасці для наймальніка.

— Гэта значыць, са сферы дзеяння закона выключаюцца замежнікі, якія працаўладкоўваюцца на тэрыторыі нашай дзяржавы па спецыяльнасці, атрымліваемай у беларускіх ВНУ або на працягу года пасля таго, як чалавек атрымаў дыплом нашага ўніверсітэта. У дадзеным выпадку наймальнік з Беларусі будзе вызвалены ад права атрымання дазволу на працаўладкаванне дадзеных замежнікаў. З чым гэта звязана? Лічыцца, што гэтая катэгорыя асоб больш хутка адаптуецца ў нашым грамадстве, паколькі на працягу пяці гадоў людзі ўжо прайшлі сацыяльную адаптацыю.

Акрамя таго, у законапраект уключана новае паняцце — высокакваліфікаваны спецыяліст.

— Наймальнік таксама будзе вызвалены ад атрымання дазволу на працаўладкаванне высокакваліфікаванага спецыяліста, паколькі ёсць неабходнасць у гэтай катэгорыі супрацоўнікаў. Высокакваліфікаваны спецыяліст — той спецыяліст, які атрымаў вышэйшую або сярэднюю адукацыю, мае стаж працы па спецыяльнасці не менш за пяць гадоў і атрымлівае сярэднюю заработную плату не менш за 15 мінімальных заработных плат.

Надзея ЮШКЕВІЧ

■

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

Государственное предприятие
«УКС Фрунзенского района г. Минска»
в дополнение и изменение к проектной декларации, опубликованной 5 марта 2015 г. в газете «Звязда».

Застройщик – Государственное предприятие «УКС Фрунзенского района г. Минска», зарегистрированное в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 27.02.2014 № 190580553.

Место нахождения: 220073, Республика Беларусь, г. Минск, 4-й Загородный пер., 64а.

Тел./факс 204-67-99, 256-64-18.

Режим работы – 8.45 – 18.00, обед 13.00 – 14.00; пятница 8.45–16.45, выходные дни: суббота, воскресенье.

Информация о проекте.

Проектом предусмотрено строительство 10-этажного жилого дома № 22 по генплану, расположенного во Фрунзенском административном районе г. Минска, на территории бывшей деревни Сухарево.

Предлагаются для привлечения к строительству по договорам создания объекта долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, **19** квартир: **3** однокомнатные (№№ 54, 69, 74) площадью 44,55 кв.м; **10** трехкомнатных квартир (№№ 44, 56 площадью 85,41 кв.м, №№ 43, 55, 63, 67 площадью 85,61 кв.м, №№ 19, 27 площадью 92,75 кв.м, №№ 9, 21 площадью 92,2 кв.м), 6 двухкомнатных (№№ 4, 8, 12, 24, 28, 32) площадью 80,41 кв.м.

Цена 1 кв. метра общей площади квартиры на дату опубликования проектной декларации составляет при строительстве однокомнатной квартиры – **17 949 000** белорусских рублей; двухкомнатной квартиры – **14 500 000** белорусских рублей, трехкомнатной квартиры – **15 750 000** белорусских рублей.

Начало строительства – 25.11.2014 года, окончание – сентябрь 2015 года.

С планировками квартир и ходом работ по строительству можно ознакомиться по адресу: г. Минск, 4-й Загородный пер., 64а, к. 102, тел. 256-64-18.

Для заключения договора необходимо:

- личное присутствие и паспорт (+ ксерокопия) лица, с кем заключается договор;

- оплата 30% стоимости объекта долевого строительства в течение 3 (трех) банковских дней с даты получения договора.

Указанная в настоящей проектной декларации цена 1 кв.м общей площади квартир и их количество считаются действительными до момента опубликования новой декларации.

УНП 190580553

НАС НЕ ПАВІННА СТАНАВІЦЦА МЕНШ!

У краіне пачалася падрыхтоўка новай праграмы дэмаграфічнай бяспекі

8 красавіка прайшло пасяджэнне Нацыянальнага камітэта па народанасельніцтве пры Савеце Міністраў пад старшынствам віцэ-прэм'ера Наталлі КАЧАНАВАЙ. У ім прынялі ўдзел члены Нацыянальнага камітэта па народанасельніцтве, кіраўнікі рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу.

На пасяджэнні была ўхвалена канцэпцыя Нацыянальнай праграмы дэмаграфічнай бяспекі Рэспублікі Беларусь на 2016-2020 гады, якую прадставіла міністр працы і сацыяльнай абароны Марыяна ШЧОТКІНА.

Фота Надзеі БУЖАН.

ЗДАРОВАЯ СЯМ'Я — ЗДАРОВАЕ ГРАМАДСТВА

Наталля Качанава адзначыла пазітыўныя вынікі, да якіх прывяла рэалізацыя Нацыянальнай праграмы дэмаграфічнай бяспекі на 2011-2015 гады. Так, упершыню за 20 гадоў у нашай краіне адзначаецца прырост колькасці насельніцтва, а ў некаторых гарадах і раёнах рэспублікі — і натуральны прырост. «Кіраўнік дзяржавы і ўрад у апошнія гады прынялі значныя меры па падтрымцы сем'яў з дзецьмі, па стымуляванні нараджальнасці. І ўжо ў 2014 годзе ў краіне нарадзілася 118,5 тысячы дзяцей — самы вялікі паказчык за апошнія гады», — заявіла Наталля Качанава. Тым не менш, па словах віцэ-прэм'ера, маюцца і негатыўныя тэндэнцыі. Да іх адносіцца высокая смяротнасць насельніцтва, у тым ліку ў працаздольным узросце.

Важным элементам дэмаграфічнай палітыкі віцэ-прэм'ер лічыць меры па паляпшэнні рэпрадуктыўнага здароўя нацыі, па ўмацаванні здароўя дзяцей і падлеткаў. Таксама неабходна, па яе словах, павышаць прэстыж сямейных каштоўнасцяў, моцнага шлюбу, адказнага бацькоўства.

НОВЫЯ ВЫКЛІКІ — НОВЫЯ ПАДЫХОДЫ

Міністр працы і сацыяльнай абароны Марыяна Шчоткіна адзначыла павелічэнне дэмаграфічнай нагрузкі на працаздольнае насельніцтва (на 1 тысячу чалавек працаздольнага ўзросту прыпадае 705 чалавек малодшых і старэйшых узростаў). Такая ўзроставая структура насельніцтва, па меркаванні Марыяны Шчоткінай, аж да 2030-х гадоў будзе аказваць негатыўны ўплыў на тэндэнцыі нараджальнасці, таму існуе вялікая верагоднасць дэмаграфічнага спаду ў найбліжэйшы час. Неспрыяльнай тэндэнцыяй з'яўляецца і тое, што стварэнне сям'і і нараджэнне дзяцей часта адкладаецца моладдзю на больш сталыя этапы жыцця. Міністр працы і сацыяльнай абароны ўпэўненая, што ўсё гэта патрабуе новых падыходаў да вырашэння дэмаграфічных праблем.

У адпаведнасці з канцэпцыяй, мэтай новай нацыянальнай праграмы з'яўляецца стабілізацыя колькасці насельніцтва. Праграма будзе ўключаць чатыры падпраграмы: «Здароўе насельніцтва і развіццё аховы здароўя», «Нараджальнасць і рэпрадуктыўныя паводзіны», «Сям'я і дзяцінства», «Міграцыя».

ЖЫЦЬ ХАЦЕЛАСЯ Б ДАЎЖЭЙ

У галіне здароўя насельніцтва неабходна дамагчыся павелічэння чаканай працягласці жыцця пры нараджэнні, зніжэння ўзроўню захворвання і смяротнасці ад неінфекцыйных захворванняў і знешніх прычын, у тым ліку людзей працаздольнага ўзросту.

Зараз розніца паміж працягласцю жыцця гарадскога і сельскага насельніцтва складае 5 гадоў, а паміж працягласцю жыцця жанчын і мужчын — 10,6 года. Неабходна скараціць гэты разрыў.

Калі браць чаканую працягласць здаровага жыцця, то ў нас яна ніжэйшая, чым у развітых краінах. Паводле дадзеных Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, у мінулым годзе працягласць здаровага жыцця для Беларусі складала 64 гады (68 гадоў для жанчын і 59 гадоў для мужчын).

Што тычыцца стану здароўя дзяцей, то на фоне зніжэння ўзроўню дзіцячай смяротнасці назіраецца рост дзіцячай інваліднасці. Асноўнымі прычынамі цяжкай (3 і 4 ступені страты здароўя) дзіцячай інваліднасці з'яўляюцца прыроджаныя анамаліі. Але, як адзначае міністр працы і сацабароны, доля здаровых дзяцей у выпускных класах школы рэзка зніжаецца. У першую чаргу — за кошт парушэнняў паставы, зроку і іншых праблем. Акрамя таго, сярод дзяцей расце захваральнасць з-за траўмаў, атручэнняў і іншых знешніх прычын.

Актуальнай для нашай краіны з'яўляецца праблема бясплоддзя — бяздзетны кожны пяты шлюб. Трывожная тэндэнцыя — той факт, што 40-50% выпадкаў бясплоддзя абумоўлены станам здароўя мужчын.

Каб палепшыць здароўе насельніцтва, неабходна рабіць акцэнт на прафілактыку і раннюю дыягностыку захворванняў, стварыць сістэму прафілактыкі неінфекцыйных захворванняў, розную для розных груп насельніцтва, развіваць медыцынскія і сацыяльныя паслугі па захаванні і ўмацаванні рэпрадуктыўнага здароўя жанчын і мужчын і інш.

КАБ ЖАНЧЫНЫ ЗАРАБЛЯЛІ БОЛЬШ

У апошнія гады павысіўся сумарны каэфіцыент нараджальнасці, а таксама назіралася павелічэнне долі нараджэння другіх і наступных дзяцей — дзякуючы мерам матэрыяльнай падтрымкі сем'яў з дзецьмі. «У далейшым мяркуецца аптымізацыя сістэмы дапамогі сем'ям з дзецьмі», — заявіла Марыяна Шчоткіна.

Але, па словах міністра, патрабуецца і актывізацыя намаганняў саміх сем'яў па забеспячэнні годнага ўзроўню і якасці жыцця. Гэтаму будзе садзейнічаць пашырэнне прымянення гнуткіх формаў занятасці. Плануецца таксама стымуляваць жанчын да павышэння сваёй кваліфікацыі, каб яны маглі (разам з дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкай) уносіць вялікую лепту ў матэрыяльны дабрабыт сям'і. Адначасова з гэтым будзе развівацца рынак даступных паслуг па доглядзе, выхаванні і развіцці дзяцей рознага ўзросту.

Спецыялісты лічаць мэтазгодным правесці маніторынг прычын разводаў і адначасова павышаць інфармаванасць сем'яў (у тым ліку маладых) аб паслугах службаў медыяцыі, развіваць службы сямейных псіхолагаў. Плануецца распрацаваць цэлы комплекс мер, накіраваных на павышэнне долі ўдзелу мужчын у пытаннях выхавання і догляду дзяцей.

МОЛАДЗЬ ПАТРЭБНА ТУТ

Нацыянальнай праграмай дэмаграфічнай бяспекі на 2016-2020 гады таксама будуць запланаваны мерапрыемствы, мэтай якіх будзе аптымізацыя міграцыйных патокаў у краіне. Для гэтага, як лічаць спецыялісты, неабходна актывізаваць работу па прыцягненні і рассяленні замежных спецыялістаў у адпаведнасці з абгрунтаванымі патрэбамі рэгіёнаў краіны. Неабходна таксама ствараць умовы, якія будуць спрыяць скарачэнню эміграцыі моладзі і высокакваліфікаваных кадраў з рэспублікі.

Святлана БУСЬКО.

ПАВЯЛІЧВАЦЬ ЦІ НЕ?

ДАМОВЯЦЦА АБ ПЕРАВОЗКАХ

Мінтранс Беларусі і Расіі на чарговай сумеснай калегіі, якая можа адбыцца ў маі-чэрвені 2015 года, абмяркуюць пытанне аўтамабільных перавозак у трэція краіны і з іх. «Для нас гэта вельмі важна, — сказаў Анатоль Сівак. — Гэтая тэма выведзена з трохбаковага дыялогу і знаходзіцца цяпер на двухбаковым узроўні. Яна і будзе прадметам абмеркавання на сумеснай калегіі», — сказаў кіраўнік ведамства.

Сёння паміж Беларуссю і Расіяй у галіне аўтамабільных перавозак у/з трэціх краін дзейнічае сістэма дазволаў. «Мы бачым напрамак дыялогу ў тым, каб шукаць канкурэнцыю не паміж намі, а паміж нашым стаўленнем да перавозчыкаў з трэціх краін», — адзначыў міністр транспарту. Паводле яго звестак, у цяперашні час Мінтранс мае пагадненні з больш чым 40 краінамі, якія рэгулююць дазволы на выкананне аўтамабільных перавозак. Штогод Мінтранс абменьваецца прыкладна 650 тысячамі адпаведных дакументаў. «Расія выдае на працягу года стабільна 150-160 тысяч дазволаў у/з трэціх краін», — удакладніў міністр. З іх на Беларусь, згодна з наяўнай дамоўленасцю, прыпадае каля 75 тысяч. У апошні час колькасць дазволаў беларускім перавозчыкам расійскі бок павялічвае.

Беларусь і Расія з 1 студзеня 2016 года плануюць пачаць так званыя кабатажныя перавозкі (калі ўнутраныя аўтаперавозкі выконваюцца перавозчыкамі замежных дзяржаў) у прыгранічных абласцях. Аднак міністр звярнуў увагу, што беларусам і расіянам патрэбен час на вырашэнне гэтага пытання. «Трэба выпрацаваць механізм кантролю за гэтым і дамовіцца аб ім», — удакладніў Анатоль Сівак.

Па словах міністра, у Мытным саюзе адбываецца рознахуткасная лібералізацыя кабатажных перавозак. «Казахстан адышоў убок і ў гэтых пытаннях да 2025 года не хоча ўдзельнічаць», — дадаў ён.

ДРУГАЯ ЎЗЛЁТНАЯ ПАЛАСА АБЫДЗЕЦЦА ТАННЕЙ

Мінтранс Беларусі разлічвае выдаткаваць на будаўніцтва другой узлётна-пасадачнай паласы у Нацыянальным аэрапорце Мінск менш за раней агучаныя 300 млн долараў. Міністр заявіў, што праектныя работы па аб'екце ўжо пачаты. «Наяўнасць беларускага падрадчыка дазваляе нам выконваць падрыхтоўчыя работы сёлета», — дадаў ён.

Нагадаем, што ў канцы сакавіка падпісаны Указ №137, згодна з якім неабходна завяршыць будаўніцтва другой узлётна-пасадачнай паласы да 2019 года. Гэта дазволіць максімальна ўключыць у рэалізацыю праекта будаўнічыя і прамысловыя арганізацыі краіны і стварыць найлепшыя ўмовы для захавання эканамічных інтарэсаў Беларусі. Раней меркавалася, што былы падрадчык, кітайская кампанія «Тачмаш», пабудуе другую ўзлётна-пасадачную паласу да 2014 года. Разам з тым праект так і не быў рэалізаваны. Указам №137 у якасці генпадраднай арганізацыі вызначана ААТ «Дарбудмантажтрэст».

Праект будзе рэалізаваны за кошт сродкаў бюджэту, дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду грамадзянскай авіяцыі і пазабюджэтнага цэнтралізаванага інвестыцыйнага фонду Мінтранса. Таксама плануецца прыцягнуць уласныя сродкі РУП «Нацыянальны аэрапорт Мінск» і банкаўскія крэдыты.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЗАО «Центр промышленной оценки» (организатор аукциона) по поручению ОАО «ОРС Гомель» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже капитального строения с инвентарным номером 320/С-26582:

Наименование	Назначение	Общая площадь	Адрес
здание магазина с бывшей портняжной мастерской	здание многофункциональное	286,4 кв.м	Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Красная, д. 1.

Составные части и принадлежности: двухэтажное кирпичное здание магазина с бывшей портняжной мастерской, сараем, уборной, забором.

Сведения о земельном участке: пл. **0.0941 га,** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания здания магазина.

Начальная цена с НДС 20% – 1 292 328 000 бел. руб.

Задаток 10% от начальной цены в белорусских рублях перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в ЦБУ № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **10** (десяти) рабочих дней после проведения аукциона.

Условия оплаты: Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после проведения аукциона.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, оплаты вознаграждения и возмещения затрат по организации аукциона, а также определения лица, выигравшего аукцион, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**

Аукцион состоится **13.05.2015** в 14.00 по адресу: г. Гомель, ул. Калинина, 14, актовый зал, Открытое акционерное общество «ОРС Гомель».

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **08.05.2015** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».

Тел.: +375 17 280 36 37; +375 29 183 69 71.
www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by

■ Сталіца

У МІНСКУ «КАМУНАЛКА» РАСЦЕ ПАКРЫСЕ

Гэтымі днямі ў галоўным мегаполісе краіны вызначаюцца новыя фіксаваныя тарыфы на жыллёва-камунальныя паслугі, якія прадастаўляюцца насельніцтву і субсідуюцца дзяржавай. Аб гэтым гаворыцца ў рашэнні Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта ад 19 сакавіка №681 «Аб некаторых пытаннях вызначэння тарыфаў на жыллёва-камунальныя паслугі», апублікаваным на Нацыянальным прававым партале.

Зразумела, што заробкі жыхароў сталіцы адрозніваюцца ад даходаў сярэднестатыстычнага работніка на перыферыі. Мабыць, менавіта таму тут і памер аплаты камунальных паслуг могуць павялічваць па асобным графіку. Добра яшчэ, што павелічэнне гэта пакуль мінімальнае. Так, фіксаваны тарыф на тэхнічнае абслугоўванне аднаго квадратнага метра агульнай плошчы жылога памяшкання ў месяц склаў 958,5 рубля (павелічэнне склала ўсяго каля 11 рублёў), на водазабеспячэнне — 1453 рублі за 1 кубічны метр (плюс 18 рублёў), каналізацыю — 970 рублёў за 1 «куб» (плюс 12 рублёў). Засталіся на ранейшым узроўні памеры тарыфу на паслугі па капітальным рамонце жылога дома, які складае 837,5 рубля за 1 квадратны метр. А вось плата за карыстанне ліфтам павялічылася ўжо на 79 рублёў і складае цяпер 6658 рублёў.

Сяргей КУРКАЧ

■

У прыватызацыі захаваецца індывідуальны падыход

А 8-гадовы ліміт на адчужэнне льготных зямельных участкаў плануюць падкарэктаваць

Як будуць прыватызаваць дзяржаўныя прадпрыемствы? Ці будзе і як уключацца ў абарот дзяржаўная маёмасць, што выкарыстоўваецца неэфектыўна? Якія змены плануецца ўнесці ў зямельнае заканадаўства? На гэтыя і іншыя пытанні адказваў падчас анлайн-канферэнцыі на сайце БЕЛТА старшыня Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі Андрэй ГАЕЎ.

ЗРАЗУМЕЛАЕ ЗАКАНАДАЎСТВА ДЛЯ ІНВЕСТАРАЎ

У адпаведнасці з заканадаўствам, рашэнні аб прыватызацыі аб'ектаў рэспубліканскай уласнасці прымае Прэзідэнт. Пры гэтым праекты рашэнняў кіраўніка дзяржавы падлягаюць абавязковаму ўзгадненню з усімі зацікаўленымі рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання і іншымі арганізацыямі. Рашэнні аб прыватызацыі аб'ектаў камунальнай уласнасці прымаюцца ў парадку, які вызначаецца мясцовымі Саветамі дэпутатаў.

Закон аб прыватызацыі ўтрымлівае патрабаванне аб абавязковым апублікаванні ў друкаваных СМІ інфармацыі аб прызначаных таргах па продажы аб'ектаў прыватызацыі, а таксама аб прадаваных аб'ектах, пакупніках і ўмовах продажу. Эксперт нагадаў, што цяпер да прыватызацыі прымяняецца індывідуальны падыход з прыцягненнем інвестара, які здольны забяспечыць выкананне ўмоў прыватызацыі па інвеставанні, выкананні сацыяльных гарантый і інш.

З улікам названых падыходаў Дзяржкамаёмасці распрацаваў метадычныя рэкамендацыі па ажыццяўленні продажу акцый і прадпрыемстваў як маёмасных комплексаў, што належаць дзяржаве. На падставе гэтых рэкамендацый для вывучэння попыту і пошуку патэнцыйных інвестараў ён фарміруе прапановы па прыватызацыі канкрэтных прадпрыемстваў.

ЧАТЫРЫ ПЛЮС ДЗЕВЯЦЬ

Летась згодна з рашэннямі Прэзідэнта праведзены здзелкі па продажы дзяржаўных пакетаў акцый 5 прадпрыемстваў: Коханаўскі экскаватарны завод, акцыянерныя таварыствы «Белгіпс» і «Гідрапрывад», Брэсцкі панчошны камбінат, а таксама адно прадпрыемства ў якасці маёмаснага комплексу рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Дзяржынскі доследна-механічны завод». Агульная сума здзелак склала 5,27 млн долараў і больш за 150 млрд рублёў.

У якасці дадатковых умоў гэтых здзелак прадугледжаны абавязацельствы пакупнікоў па ажыццяўленні інвестыцый у развіццё (мадэрнізацыю) набытых прадпрыемстваў на агульную суму 43 млн еўра і 5 млн долараў, а таксама 300 млрд рублёў і па пагашэнні пры неабходнасці запазычанасці прададзеных прадпрыемстваў. Інвестар павінен захаваць (павялічыць) колькасць працоўных месцаў і сярэднямесячную заработную плату, забяспечыць рост аб'ёмаў прамысловай вытворчасці. Па камунальнай уласнасці праведзены здзелкі па продажы пакетаў акцый 9 акцыянерных таварыстваў на суму 230 млрд рублёў.

ЭЛІТНУЮ ЗЯМЛЮ Ў ПРЫГАРАДАХ — І САДАВОДАМ ЗА ГРОШЫ

Жыхары буйных гарадоў не зусім разумеюць, чаму раптам было ўведзена абмежаванне на продаж дач пад Мінскам і вакол абласных цэнтраў, а свабодныя зямельныя ўчасткі ў садовых таварыствах у прыгараднай зоне Мінска вырашана прадастаўляць выключна па выніках аўкцыёнаў.

Андрэй Гаеў растлумачыў, што адпаведны дакумент, які ўступіў у сілу з 1 студзеня, падрыхтаваны па прапановах Мінскага абласнога выканаўчага камітэта. На думку гэтага выканкама, у садаводаў і грамадзян, якія жадалі атрымаць зямельныя ўчасткі для будаўніцтва жылога дома, было няроўнае становішча. Часта на ўчастках, якія браліся для калектыўнага садаводства, будаваліся дамы, якія па тэхнічных характарыстыках былі роўныя жылым дамам, а то і пераўзыходзілі іх. У той жа час такія ўчасткі атрымліваліся без аўкцыёну, а ўчасткі для будаўніцтва жылога дома — толькі праз аўкцыён.

У сувязі з тым, што тэрыторыя прыгараднай зоны Мінска насычана садовымі таварыствамі (толькі ў Мінскім раёне іх 320) і свабодных масіваў практычна не засталося, указам №387 уведзена забарона на стварэнне новых таварыстваў і дачных кааператываў. У прыгарадных зонах Мінска і абласных цэнтраў уведзена і забарона на адчужэнне (куплю-продаж, мену, дарэнне) зямельных участкаў, якія прадастаўлены ў прыватную ўласнасць для калектыўнага садаводства (у тым ліку зямельных участкаў, створаных у выніку іх падзелу, зліцця), а таксама на перадачу ў арэнду да заканчэння 5 гадоў з дня дзяржаўнай рэгістрацыі правоў на іх.

Андрэй Гаеў падкрэсліў, што забарона на адчужэнне тычыцца выключна зямельных участкаў, прадастаўленых грамадзяніну мясцовым выканаўчым камітэтам для вядзення калектыўнага садаводства ў прыватную ўласнасць, калі з моманту дзяржаўнай рэгістрацыі ў грамадзяніна права прыватнай уласнасці на іх не мінуў пяцігадовы тэрмін.

Такім чынам, забарона на адчужэнне зямельных участкаў не тычыцца тых «кавалкаў зямлі», права прыватнай уласнасці на якія перайшло па спадчыне (незалежна ад даты дзяржаўнай рэгістрацыі права прыватнай уласнасці спадчынадаўца і спадчыннікаў на зямельны ўчастак); якія набыты грамадзянінам на падставе грамадзянска-прававых здзелак (на падставе дагавораў куплі-продажу, дарэння, мены і г.д.). Не варта хвалявацца гаспадару зямлі, што належыць яму на праве пажыццёвага спадчыннага валодання або арэнды і была выкуплена ім у прыватную ўласнасць, калі з моманту дзяржаўнай рэгістрацыі права пажыццёвага спадчыннага валодання або арэнды ў асобы, якой першапачаткова зямельны ўчастак быў прадастаўлены мясцовым выканаўчым камітэтам для вядзення калектыўнага садаводства, прайшоў 5-гадовы тэрмін.

МЯЖУ НЕ ЗРУШЫШ

Спадар Гаеў паведаміў, што Дзяржкаммаёмасці падрыхтаваў праект указа кіраўніка дзяржавы, які ўносіць змяненні ва ўказы № 667 і № 26. Новы дакумент прадугледжвае магчымасць прадастаўлення зямельных участкаў новаму забудоўшчыку шматкватэрнага дома без аўкцыёнаў, а таксама арганізацыям спажывецкай кааперацыі зямельных участкаў для будаўніцтва і абслугоўвання аб'ектаў аптовага і рознічнага гандлю ці грамадскага харчавання.

Прапануецца прадаставіць правы мясцовым выканаўчым камітэтам даваць згоду на адчужэнне жылых дамоў і (або) зямельных участкаў, атрыманых грамадзянамі, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, да заканчэння 8 гадоў з дня дзяржаўнай рэгістрацыі ўзведзеных на іх жылых дамоў у выпадку датэрміновага альбо поўнага пагашэння льготнага крэдыту ў выключных выпадках (напрыклад, накіраванне на службу ў іншую мясцовасць, страта карміцеля ў сям'і, атрыманне I або II групы інваліднасці).

ЗАСЯЛЯЦЬ БУДУЦЬ ХУТЧЭЙ

Праект новаўвядзення ўдвая скарачае (з 60 да 30 каляндарных дзён) тэрміны афармлення зямельных участкаў, неабходных для абслугоўвання пабудаваных і прынятых у эксплуатацыю шматкватэрных жылых дамоў. Гэта сапраўды добрая навіна, бо чаканне ключоў ад уласнай кватэры каштуе дорага.

А яшчэ рашэнні аб правядзенні аўкцыёнаў з умовамі на права праектавання і будаўніцтва капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў) на зямельных участках, на якіх знаходзяцца аб'екты, што падлягаюць зносу, будуць прымацца не толькі Мінскім гарадскім выканаўчым камітэтам і гарадскімі выканаўчымі камітэтамі абласных цэнтраў, але і раённымі, гарадскімі (гарадоў абласнога, раённага падпарадкавання) выканаўчымі камітэтамі.

Прыняцце праекта ўказа дасць магчымасць пры невыкананні (парушэнні) забудоўшчыкам абавязацельстваў па стварэнні аб'екта будаўніцтва шматкватэрнага жылога дома мясцовым выканкамам ажыццявіць спыненне правоў на зямельныя ўчасткі ў ранейшых забудоўшчыкаў і перадаць іх новым забудоўшчыкам у кароткія тэрміны. Цяпер скароцяцца тэрміны і выдаткі на будаўніцтва новых гандлёвых аб'ектаў (аб'ектаў крокавай даступнасці) арганізацый спажывецкай кааперацыі на тэрыторыях, якія патрабуюць развіцця гандлёвай інфраструктуры (у зонах новых жылых забудоў).

БЕЗ ПОШЛІН І НЕДАКЛАДНАСЦЯЎ

Мяркуецца, што да 1 студзеня 2017 года сельскагаспадарчыя арганізацыі і дзяржаўныя лесагаспадарчыя ўстановы вызваляць ад аплаты дзяржаўнай пошліны за выдачу (афармленне) правазасведчвальных дакументаў на зямельныя ўчасткі, якія прадастаўлены такім арганізацыям для вядзення сельскай і лясной гаспадаркі.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Дзяржаўны камітэт па маёмасці будзе абавязаны не радзей за адзін раз у месяц не пазней за 10-е чысло наступнага месяца накіроўваць у Камітэт дзяржаўнага кантролю і яго тэрытарыяльныя органы інфармацыю аб выяўленых парушэннях парадку адабрання і прадастаўлення зямельных участкаў, пераводу зямельных участкаў з адной катэгорыі (віду) у іншую.

РЫХТУЕЦЦА КАРПАРАТЫЎНЫ КОДЭКС

У сферы рэгулявання зямельных адносінаў падрыхтаваны адпаведны праект указа, які накіраваны на далейшае ўдасканаленне працэдуры афармлення зямельных участкаў. Гэтак жа і ў адносінах да тых аб'ектаў, што знаходзяцца на зямельных участках, у частцы кіравання будынкамі, збудаваннямі, акцыямі акцыянерных таварыстваў. Падрыхтаваныя праекты нарматыўных прававых актаў накіраваны на вырашэнне пытанняў, звязаных з адменай права пераважнай куплі выканкамамі акцый, таму што Беларусь уступіла сумесна з Расіяй і Казахстанам у ЕАЭС. Маецца на ўвазе, што з 2017 года любыя абмежаванні на здзяйсненне такога кшталту аперацый павінны зняць. «Нам трэба рухацца менавіта ў гэтым кірунку», — упэўнены Андрэй Гаеў.

Сёння таксама падрыхтаваны праект карпаратыўнага кодэкса, які плануецца ўкараняць у акцыянерных таварыствах, найперш тых, дзе акцыі знаходзяцца ў дзяржуласнасці. Камітэт пакрокава будзе рухацца ў гэтым кірунку, каб фарміраваліся назіральныя саветы, каб у іх склад уключаліся прафесійныя карпаратыўныя кіраўнікі. На ўзроўні найлепшых сусветных узораў плануецца зрабіць заканадаўства ў гэтай сферы, уключаць прадстаўнікоў працоўных калектываў у назіральныя саветы, а не толькі менеджменту таварыстваў. Усё гэта робіцца для таго, каб карпаратыўнае кіраванне давала належную аддачу і прадстаўнікі мелі не намінальны характар, а ўносілі рэальны ўклад ва ўдасканаленне кіравання акцыянернымі таварыствамі. Кодэкс знаходзіцца на ўзгадненні. Казаць аб канкрэтных тэрмінах нельга, але плануецца ў найбліжэйшай перспектыве завяршыць працу і ўводзіць новы дакумент у дзеянне.

Сяргей КУРКАЧ.

З СУСЕДЗЯМІ ПА-СУСЕДСКУ

Рыжскі порт чакае беларускія грузы.

Латвійская дэлегацыя на чале са старшынёй Рыжскай думы Нілам УШАКОВЫМ прыехала ў Мінск. Разам з ёй — прадстаўнікі 26 латвійскіх кампаній па такіх напрамках, як экалагічная ўтылізацыя адходаў, цепла- і біяэнергетыка, вытворчасць энергіі з аднаўляльных крыніц, грамадскі транспарт. Тут яны жадаюць знайсці новых дзелавых партнёраў і новыя магчымасці рэалізацыі патэнцыялу супрацоўніцтва дзвюх краін.

АД ТУРЫЗМУ ДА ДЗІЦЯЧЫХ САДКОЎ

Старшыня Мінгарвыканкама Андрэй ШОРАЦ і Ніл Ушакоў падпісалі праграму супрацоўніцтва паміж мэрыямі гарадоў на 2015—2017 гады. У найбліжэйшы час бакі абмяркуюць канкрэтныя праекты, якія будуць рэалізаваны паміж двума гарадамі. Андрэй Шорац падкрэсліў, што мінскія спецыялісты з вялікай цікавасцю вывучаць вопыт Рыгі па прыцягненні турыстаў, а таксама па стварэнні ўмоў для развіцця прыватных дзіцячых садкоў.

«Наогул, у нас шмат напрамкаў для супрацоўніцтва. Цікавы досвед Рыгі ў сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі і транспарту. Думаю, што ў найбліжэйшы час мы пачнём рэалізацыю канкрэтных праектаў у розных сферах», — адзначыў мэр Мінска.

Андрэй Шорац таксама заявіў, што Беларусь будзе імкнуцца падвоіць колькасць латвійскіх турыстаў. У сваю чаргу старшыня Рыжскай думы Ніл Ушакоў канстатаваў, што летась колькасць беларускіх турыстаў у Рыгу павялічылася ў два разы.

КУДЫ «ПАЕЗДЗЕ» НАШ МАЗУТ?

Сёння Латвія зацікаўлена ў перавозках беларускага мазуту праз Рыжскі свабодны порт. Адным з варыянтаў з'яўляецца дыверсіфікацыя, калі частка грузаў ідзе праз Клайпеду, частка — праз Рыгу.

Латвія займае шостае месца сярод краін, якія імпартуюць прадукцыю мінскіх прадпрыемстваў. Беларусь пастаўляе ў Латвію нафтапрадукты, рапсавы алей, лесаматэрыялы, кантрольна-вымяральныя прыборы. З суседняй краіны імпартуюцца лекі, адзенне, металаканструкцыі, рыба, апрацаваны камень. Пачынаючы з 2013 года таваразварот паміж Латвіяй і Беларуссю істотна знізіўся за кошт падзення беларускага экспарту. Асноўнай прычынай пагаршэння яго дынамікі з'яўляецца спыненне транзіту праз марскія парты Латвіі прадуктаў нафтаперапрацоўкі (растваральнікаў і змазачных матэрыялаў з 2013 года, прадуктаў перагонкі каменнавугальнай смалы з 2014-га), а таксама зніжэнне аб'ёмаў паставак нафтапрадуктаў.

Стратэгічным напрамкам двухбаковага супрацоўніцтва з'яўляецца транспартна-транзітная сфера. Беларускія грузы займаюць другое месца ў агульным аб'ёме чыгуначных перавозак Латвіі. У 2014 годзе іх аб'ём склаў 6,6 млн тон, грузаперавозак — 30,1 млн тон.

«РЫЖСКІ ДВОРЫК» У МІНСКІХ КРАМАХ

У Мінску можа з'явіцца «Рыжскі дворык», у Рызе — «Мінскі». Як адзначыў Ніл Ушакоў, гэта праект, з якім працавалі ў Маскве, прычым працавалі паспяхова да ўвядзення санкцый. У сваю чаргу Андрэй Шорац выказаў перакананасць, што крокам у адказ стане з'яўленне «Мінскага дворыка» ў Рызе. Сутнасць праекта ў тым, каб у гандлёвых сетках быў куток, дзе стаялі стэнды з латвійскай экалагічна чыстай прадукцыяй. На пачатак года ў Беларусі працавалі 772 кампаніі, створаныя юрыдычнымі і фізічнымі асобамі Латвіі, у тым ліку ў 2014 годзе зарэгістравана 66 юрыдычных асоб з латвійскім капіталам. У Латвіі зарэгістравана больш за 2 тысячы прадпрыемстваў з беларускім капіталам.

Ілья КРЫЖЭВІЧ.

ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

ЗВЯЗДА
НАПЕРАД У МІНУЛАЕ
3 БЕЛАРУСЬ
Сумесны праект «Звязды» і «Беларусь 3»

«ДУБРАВА», ДЗЕ МАТЧЫНЫ ПЕСНІ ГУЧАЦЬ,

або Чаму варта дома бываць часцей

Прычын завітаць у беларускую глыбінку шмат. Вёска для аматараў вандраваць — сапраўдная скарбніца. Накіроўваючыся туды ў кампаніі здымачнай групы праграмы «Наперад у мінулае» (яна выходзіць на тэлеканале «Беларусь 3»), заўсёды ведаеш, што цябе чакае сустрэча з цікавымі людзьмі, у сэрцах якіх усё яшчэ гучыць народная песня. Не выключэнне і народны фальклорны ансамбль «Дубрава» з вёскі Цялуша Бабруйскага раёна.

Калі мы пад'ехалі да вясковага клуба, дзе была прызначана сустрэча з калектывам, аказалася, што артысты яшчэ не вярнуліся з канцэрта ў райцэнтры. Пакуль чакалі, была магчымасць пазнаёміцца з вёскай. Цялуша сёння ўжо стала аграгарадком. Як паведаміла жанчына з мясцовых, для маладых сем'яў пабудавалі два дамы, але ў большасці сваёй людзі сюды прыязджаюць на лецішча. Гісторыя самой вёскі мае адметныя старонкі. Напрыклад, калі пад'язджаеце да Цялушы, то заўважаеце купалы Свята-Мікольскай царквы, якую ўзвялі тут дзякуючы намаганням Паўла Варанцова-Вельямінава і яго жонкі Наталлі Пушкінай (унучкі Аляксандра Пушкіна). Храм быў пабудаваны ў 1902 годзе. Расказваюць, што для вырабу цэглы майстры нават збіралі яйкі па хатах. Потым на гэтай аснове замешвалі гліну, і канчатковы матэрыял атрымліваўся вельмі моцным. Пабудова дажыла да нашых дзён. Амаль побач з царквой па ініцыятыве Наталлі Аляксандраўны была пабудавана таксама школа для сялянскіх дзяцей...

Існуе некалькі версій паходжання назвы населенага пункта. Паводле адной, вёска стала так называцца, бо ў гэтай мясцовасці гандлявалі цялятамі, паводле іншай, тут нарыхтоўвалі бярвенне, якое называлася «целехамі» (неабчасаныя бярвёны). Тут з павагай і ашчаднасцю ставяцца да скарбаў мінулага, і гэта датычыцца не толькі песеннага фальклору.

Напрыклад, з мінулага года пачалі адраджаць ткацтва. «У нас ёсць Пятроўскі дом народнай творчасці, пры якім створана аб'яднанне «Пятроўскія ткачы». Там людзі самі аднавілі ткацкі станок, і пераймаюць вопыт мясцовых ткачых, — расказвае **метадыстка раённага Цэнтра культуры Ірына ГОМАНАВА.** — Нейкія веды па гэтай тэме збіралі самастойна па крупінках. Цяпер пачалі займацца пляценнем паясоў на бёрдах.

Што датычыцца Цялушскага народнага фальклорнага ансамбля «Дубрава», дык летась калектыў адзначыў свой 50-гадовы юбілей, але святкаванне перанеслі на гэты год і прымеркавалі да 175-годдзя самой вёскі. Будуць двайное свята ладзіць».

З самім калектывам мы пазнаёміліся ўжо падчас іх выступлення на сцэне. У складзе яго — адны жанчыны, і змест песень адпаведнай тэматыкі. Спяваюць усё акапэльна, што дазваляе яшчэ больш пранікнуцца чароўным шматгалоссем выканаўцаў...

Вецер вее, да вецер вее, да вецер павявае,
Да вецер вее, да вецер павявае,
Маці ў доні, да маці ў доні да пра жызню пытае,
Да маці ў доні да пра жызню пытае:
— Пытай, маці, да пытай, маці, дай у шэрай вуцяці.
Да пытай, маці, дай у шэрай вуцяці.
Шэра вуця, да шэра вуця дай на моры начуе,
Да шэра вуця дай на моры начуе
Яна ж маё, да яна ж маё да ўсё горачка чуе,
Да яна ж маё да ўсё горачка чуе.
Перша гора, да перша гора дай дзяціна малая,
Да перша гора, дай дзяціна малая.
Друга гора, да друга гора дай свякроўка ліхая,
Да друга гора дай свякроўка ліхая.
Трэця гора, да трэця гора дай мяне муж пакідае,
Да трэця гора дай мяне муж пакідае.

Усе свае песні ўдзельніцы ансамбля перанялі ад сваіх родных: маці, бабуль. А ў некага і дзед, і дзядзька спявалі. Напрыклад, песня, якая дасталася адной з удзельніц ад мамы, прывезена з Брэстчыны.

— Бабуля нарадзіліся на гэтай зямлі. Мама выйшла замуж на Брэстчыну, а потым я ў 1974 годзе вярнулася сюды, працавала спачатку ў Бабруйску на футравай фабрыцы, выйшла замуж за ступянёўскага хлопца (Цялуша і Ступені — суседнія вёскі). А пазней старшыня сельсавета накіраваў мяне сюды працаваць, калі мясцовы клуб апусцеў. З 1981 года я тут, — расказвае **дырэктарка Цялушскага селькага дома культуры Ніна СЯМЁНАВА.**

Раней, успамінаюць жанчыны, калі тэлевізара ў хатах не было, збіраліся на вячоркі. Спявалі, танцавалі — і ўсім было весела. Калі арганізавалі хор, туды прыходзіла 36 чалавек, людзі самых розных прафесій. Сёння часы не тыя, але гэта не перашкаджае мясцовым артысткам дзяліцца прыгожымі песнямі з іншымі людзьмі. У кожнай з жанчын — свая гісторыя ўзаемаадносін з народнай песняй. Пазнаёміўшыся з Соф'яй Сяліцкай, якая ў калектыве спявае ўжо больш за трыццаць гадоў, даведалася аб прычыне яе прыходу ў ансамбль.

Соф'я Паўлаўна СЯЛІЦКАЯ.

— Мая маці хадзіла спяваць у хор. Песні, ведаеце — гэта песні... — задумліва адзначае Соф'я Паўлаўна. — Я прыйшла ў хор у 1982 годзе, калі памерла мая свякроў. Складана перажывала яе спачын, бо мы пражылі з ёй 24 гады ў дружбе і згодзе. Успамінаю і плачу — вельмі добрым чалавекам яна была. Майго мужа забралі ў армію, калі нашай старэйшай дачцэ было 7 дзён. І ён служыў тры з паловай гады, а я жыла з яго маці. Ніколі нават не сварыліся. Фёдар прыйшоў з арміі, і мы яшчэ дзвюх дачок нарадзілі.

У дзень нашага знаёмства Соф'і Паўлаўне споўнілася 77 гадоў. Як сапраўдная артыстка, свой дзень нараджэння яна адзначала на сцэне. Выступала ў кашулі, сатканай некалі свякрухай. Усё сваё жыццё жанчына пражыла на роднай зямлі, у Цялушы.

— Запомніўся адзін выпадак, калі вайна скончылася. У лесе каля вёскі мы з сястрой знайшлі скрыню з рознымі школьнымі прыладамі. Паколькі скрыня была цяжкая, то вырашылі паклікаць на дапамогу. І раптам бачу такую карціну: ідуць тры салдаты, адзін сперади і два за ім. І таго, што крочыў першым, застрэлілі, сказалі: «Ты дзезярцір!» Стаяць іх твары ў вачах, — дзеліцца бабуля. — Ой, спяваюць ужо, трэба ісці...

Парадзіла мяне мамка ў святую нядзельку.
Ой, дала мне горкую долю — дзе яе я дзену, дзе яе я дзену?
Ой, пайду я з горкаю доляй у лес заблужусь, у лес заблужусь.
Ой, пайду я к сіняму мору ў морушка ўтаплюсь, у морушка ўтаплюсь.
Ой, пайду я ў чыста поле за ветрам пушчусь, за ветрам пушчусь.
Ой, нясі ты з ветрам гора, нясі, не спаткніся, нясі, не спаткніся.
Стаіць дуб у чыстым полі — ля яго спынісь, ля яго спынісь.
І з яго зялёным лістам крэпка абдымісь.

Песню выканала сольна Раіса Алонцава, якая таксама ў калектыве даўно. Пачаў сваю дзейнасць народны фальклорны ансамбль «Дубрава» ў 1964 годзе. Званне народнага атрымаў толькі ў 1992-м. За гады свайго існавання тут неаднаразова мяняліся кіраўнікі і ўдзельнікі. Аднак нязменнай застаецца жаданне людзей спяваць. Ансамбль — заўсёды жаданы госць на фестывалях, у іншых вёсках раёна.

Амаль напрыканцы свайго выступлення жанчыны выконваюць песню:

Сіня мора калыхаецца,
Эй, арол з лебедзем купаецца.
Арол з лебедзем купаецца,
Эй, арол лебедзя пытаецца:
— Эй, ці не быў ты на маёй старане?
Ці не быў ты на маёй старане?
Ці не тужаць ацец, маць аба мне?
— Яны тужаць шчэ й пячаляцца,
Эй, цябе ў госці дажыдаюцца.

І адразу ўзгадваецца верш Рыгора Барадуліна: «Трэба дома бываць часцей,/ Трэба дома бываць не госцем,/ Каб душою не ачарсцвець,/ Каб не страціць святое штосьці»... Калі ў вас яшчэ ёсць у каго распытаць пра гісторыю сям'і, з кім узгадаць падзеі дзён мінулых, не адкладвайце гэтых размоў. Запамінайце галасы, занатоўвайце ўспаміны, спявайце разам.

Алена ДРАПКО.

■ Тэлесеткі

ХТО МОЖА, ТОЙ — ПАКАЖА

Зусім няшмат часу засталося да фіналу маштабнага тэлепраекта — народнага шоу талентаў «Я магу!», распачатага Белтэлерадыёкампаніяй яшчэ летась. 29 красавіка ў завяршальным выпуску праекта па выніках інтэрактыўнага галасавання гледачоў вызначыцца, каму з таленавітых беларусаў дастанецца галоўны прыз — аўтамабіль Geely EX7 і грашовы бонус у дадатак.

Па выніках 10 кваліфікацыйных раўндаў, якія ўжо адбыліся, журы і гледачы выбралі сваіх кандыдатаў на перамогу. Усе ўдзельнікі вельмі розныя, а таму жарсці абяцаюць разгарнуцца нежартоўныя.

Ужо вядома, што барацьбу за перамогу працягнуць выканаўца песень у стылі ёдль Елізавета Панасюк з Брэста і самая малодшая ўдзельніца шоу — 3-гадовая акрабатка Дамініка Панцялеева з Бабруйска; Ганна Мельнікава з Гродна (11-гадовая дзяўчынка, інвалід па слыху, расчуліла журы да слёз сваім філігранным гімнастычным нумарам) і 19-гадовы студэнт — спявак-аматар Андрэй Васілец; танцор і жанглёр з Мінска Ігар Чыпоўскі і 11-гадовая спявачка Ганна Цітовіч з вёскі Скокі Брэсцкага раёна; самадзейны артыст гумарыстычнага жанру — супрацоўнік МНС Аляксандр Якаўлеў з Гарадка Віцебскай вобласці і памочнік машыніста цеплавоза, а ў вольны час спявак Дзмітрый Іваненка з Маладзечна; радавы тэрміновай службы, ён жа выканаўца ў стылі бітбокс Ілья Данільчык з Баранавіч, дуэт самадзейных выканаўцаў Дзмітрыя Герасімчыка і Дзяніса Казея (адзін з хлопцаў са Слоніма, другі ўраджэнец Хоцімска) з крыху хімічнай назвай «RAZ2SO4», мастачка Святлана Саўчук з вёскі Мельнікі Брэсцкай вобласці і ілюзіяніст Аляксандр Урбановіч з Ліды, артыст арыгінальнага жанру Марцін Март (творчы псеўданім Дзмітрыя Марціноўскага з Мінска і культарганізатар з Гродна Надзея Маркевіч — выканаўца песень з дапамогай мовы жэстаў, чалавек-аркестр з Брэста Аляксей Паўловіч, які можа сыграць практычна любую мелодыю... на зубах, і маладая танцавальная каманда «Infinity» з Віцебска; гітарыст з незвычайнай манерай выканання FERGIO (сцэнічнае імя Фёдара Лысенкі з Мінска) і баранавіцкая студыя сучаснага танца Ananko dance scool; фокуснік Павел Шчарбак з Брэста і прафесійны музычны калектыў Jazz City Band з Магілёва. Колькасць гледачоў, што галасуюць за ўпадабаных таленавітых землякоў, з кожным выпускам толькі павялічваецца, у сацыяльных сетках разгараюцца гарачыя дыскусіі, хто больш варты галоўнага прыза...

Фота: www.tvr.by.

Чакаць вырашэння інтрыгі засталося ўсяго нічога. Апошнія некалькі ўдзельнікаў фінальнага шоу вызначацца ў найбліжэйшы час. «А ўжо на майскія святы пераможца зможа паехаць дамоў на ўласным аўтамабілі!» — запэўніваюць арганізатары праекта «Я магу!».

Вікторыя ЦЕЛЯШУК

Дбаць — не плот гарадзіць

Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» гульня «Размаўляем па-беларуску». Для таго, каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт http://tvrgomel.by або http://3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Папярэдне ж праверыць сваё веданне роднай мовы можна з дапамогай «Звязды». Ці ведалі вы, што (паэтычныя прыклады ўзяты з паэмы Якуба Коласа «Новая зямля»):

Кілішак — шкляная чарка на ножцы.

— Ну, што ж? — пытае дзядзька Грышку.

— Хіба дзе выпіць па кілішку.

Шу́ла і шуло́ — слуп, на які падвешваецца створка варот.

Ўжо весялей на свет глядзелі
Будынкі гэтыя старыя —
Яны зрабілісь як не тыя.
Агледзеў іх Антось, падправіў
І шулы новыя паставіў.

Дбаць — праяўляць клопат, турбавацца. Ёсць прыказка: хто дбае, той і мае.

Ліпець — ледзь-ледзь трымацца.

Было відаць, што тут ліпелі
Да часу людзі і не дбалі,
Гразі ніколі не знімалі.

Крышан — плоскі кусок чаго-небудзь ядомага.

І хлеба ёсць крышан са мною,
Чаго ён сохне сіратою?

Студня — звычайны калодзеж.

Студні вочап адзінока
Тырчаў над хатаю высока.

Браць ногі ў рукі — уцякаць. Беларусы яшчэ скажуць: даваць дзёру, падмазваць пяты. Рускія — «давать драла». Мяркуюць, што выраз «браць ногі ў рукі» звязаны са словазлучэннем «браць боты на плечы», у тым сэнсе, што чалавек разуваўся, калі яму пагражала небяспека і трэба было хутка бегчы. Ён шырока ўжываецца ў беларускім і ўкраінскім маўленні, да яго шмат сінонімаў: «даваць лататы, дзёру, стракача, драпака, змотваць вудачкі».

Плот гарадзіць — гаварыць глупства, абы-што, лухту плесці, па-руску — молоть языком, пороть ахинею. Выраз «гарадзіць плот» лёгка паблытаць з выразам «агарод гарадзіць» — што адзначае задумваць ці распачынаць якую-небудзь клопатную, бесперспектыўную справу.

Чарговыя выпускі тэлевіктарыны глядзіце ў эфіры «Беларусь 3» кожную суботу ў 11.10—11.25.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ПАГЛЯДЗІМ ЯШЧЭ АДЗІН ЧЭМПІЯНАТ СВЕТУ

Як добра ведаюць спартыўныя балельшчыкі, сёлета першынство свету па міні-футболе ўпершыню за апошнія 2 дзесяцігоддзі вяртаецца з Лацінскай Амерыкі ў Еўропу і пройдзе з 17 па 25 красавіка ў нашай краіне.

А вось што стане для заўзятараў прыемнай навіной, дык гэта паведамленне, што ўсе гульні форуму можна будзе паглядзець у прамых трансляцыях на тэлеканалах «Беларусь 2» і «Беларусь 5». Як паведамілі «Звяздзе» ў прэс-службе Белтэлерадыёкампаніі, першы матч чэмпіянату Беларусь — Бразілія пакажа ў прамым эфіры 17 красавіка ў 18.55 тэлеканал «Беларусь 2». Трансляцыі дзвюх чвэрцьфінальных гульняў гледачам прапануюць 22 красавіка «Беларусь 5» (у 18.10) і «Беларусь 2» (у 20.10). Нацыянальны спартыўны тэлеканал пакажа таксама ўсе матчы, якія будуць згуляны ў Мінску, акрамя выніковых: паўфінальныя паядынкі, матч за бронзу і фінал будзе трансляваць «Беларусь 2».

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

ПАНЯДЗЕЛАК, 13 КРАСАВІКА

БЕЛАРУСЬ 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.45 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 19.40, 0.30 Зона Х.
9.10 Галоўны эфір.
10.05 Клуб рэдактараў.
10.40, 20.00 Да 70-годдзя Перамогі. Дэтэктыў «Ваенная разведка. Паўночны фронт».
11.00, 13.00, 16.00 90 секунд.
11.50 Меладрама «Знайдыш».
13.50, 15.55 Меладрама «Не было б шчасця 2». 1–4-я, заключная, серыі.
15.15, 18.40 Навіны рэгіёна.
17.35 Беларуская часінка.
19.20 Арэна.
21.00 Панарама.
21.45 Форум.
22.45 Серыял «След».
1.05 Дзень спорту.
1.15 Драма «Дом на абочыне».

БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Тэлераніца.
9.00, 10.00, 21.30 Тэлебарометр.
9.05, 16.45 Серыял «Асабістыя матывы».
10.35 Серыял «Мама — дэтэктыў».
12.40 Да 70-годдзя Перамогі. Баявік «Дыверсант». 1—4-я серыі.
17.50, 1.00 Серыял «Віртуозы».
18.50, 20.25 Серыял «Інтэрны».
19.55 «Хачу ў тэлевізар».
20.55 Мазгавы штурм.
21.35 КЕНО.
21.40 Серыял «Косці».
23.35 Серыял «Як я сустрэў вашу маму».
0.00 Серыял «Быць чалавекам».

БЕЛАРУСЬ 3

7.15 «Дабраранак».
7.45 «Хачу ўсё ведаць!».
8.00, 12.55, 19.30, 0.00 Калейдаскоп.
8.10 «Дыя@блог P.S.».
8.35 «Спячая прыгажуня». Фільм-казка.
10.10 «Культпрасвет».
10.45 «Першы рыцар». Драма.
13.05 Да 70-годдзя Вялікай Перамогі. «Благаславіце жанчыну». Меладрама.
14.55 «Французскі матыў маэстра Косма». Дак. фільм.
15.25 «Сакавік-красавік». Драма.
16.20 «Персона». Карэн Шахназараў.
16.50 «Гваздзік». Драма.
17.35, 21.00 «Дыя@блог». «Пра мову».
18.00 «Спакуса Дон Жуана». Драма.
19.40 «Дзяржаўная мяжа». Фільм першы «Мы наш, мы новы...» 1-я серыя.
20.45 «Калыханка».
21.30 Хіт-парад. «Сто песень для Беларусі».
22.20 «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
22.50 «Ля сіняй бухты». Кароткаметражны фільм.
23.40 «Персона». Таццяна Міхалкова.

БЕЛАРУСЬ 5

7.00, 0.50 PRO спорт. Навіны.
8.00 Футбол. Чэмпіянат Англіі. КПР — «Чэлсі».
9.55 Баскетбол. НБА. «Бостан» — «Кліўленд».
11.50 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Манчэстэр Юнайтэд» — «Манчэстэр Сіці».
13.40 Тэніс. Турнір ВТА. Чарльстан. Фінал.
15.45 Хакей. Еўрачэлендж. Данія — Беларусь.
17.40 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
18.40 Час футбола.
19.25 Хакей. КХЛ. Фінал. Другі матч.
21.55 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Ліверпуль» — «Ньюкасл».
23.55 Еўрапейскі покерны тур.

АНТ

6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 Контуры.
10.00 «Жыць здорава!».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00 Навіны спорту.
11.10 «Фазэнда».
11.55 «Модны прыгавор».
13.10 «Мужчынскае/Жаночае».
14.10 «Сам-насам з усімі».
15.05, 16.15 «Час пакажа».
16.50 «Давай пажэнімся!».
18.20 «Адваротны адлік. «Польская песня. Таленты і палкоўнікі».
19.00 «Чакай мяне».
20.00 Час.
21.05 «Справа прынцыпу».
22.15 «Танцуй».
0.45 Начныя навіны.

СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
8.30 «Тыдзень».
9.25 «Вялікае снеданне».
10.05 «Далёкія сваякі».
10.40, 17.30 «Званая вячэра».
11.35 «Сямейныя драмы».
12.30 «Не хлусі мне!».
13.50 «Вялікі горад».
14.25 «Такі лёс».
15.10 «Гэта — мой дом!».
15.35 «Мае цудоўныя...».
16.50 Серыял «Вовачка 4».
18.30, 1.55 Серыял «Мяжа часу».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 «Ваенная тайна».
23.00 «Тыдзень спорту».
23.30 Маст. фільм «Апошні ўрок».
1.05 «Дакументальны праект»: «Падводны Сусвет».

МІР

6.00 «180 хвілін».
9.00 «Беларусь сёння».
9.30, 1.30 Маст. фільм «Нядзельны тата».
11.05 Маст. фільм «Упершыню замужам».
13.00, 16.00, 19.00, 23.00 Навіны (бягучы радок).
13.20, 3.05 Дак. серыял «У свеце міфаў і памылак».
14.15 Серыял «Джамайка».

16.25, 0.35 Ток-шоу «Слова за слова».
17.20, 4.00 Серыял «Таварышы паліцэйскія».
19.25 Маст. фільм «Бумеранг».
21.10, 23.15 Серыял «Двое з куфра-2».
0.25 Навіны (бягучы радок). Гарачая тэма.

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Раніца Расіі».
10.00 «Карціна свету».
10.55 Надвор'е на тыдзень.
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.35 «Эвалюцыя будучыні».
12.30 «Мая планета».
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.30 Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
15.30 «Прамы эфір».
17.10 Серыял «Апошні янычар».
18.00 «Асаблівы выпадак».
18.55 «Эвалюцыя будучыні».
20.55 Серыял «Кветкі чаромхі».
21.55, 23.10 Серыял «Скліфасоўскі».
23.55 «Штурм Берліна. У логаве звера».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.00 «Кава з малаком».
9.05 «Справа ўрачоў».
10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара. Новыя серыі».
12.00 «Суд прысяжных».
13.15 «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
14.15 «Ядзім дома».
14.45, 22.15 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
15.10 «Усё будзе добра!».
16.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».
18.00 Ток-шоу «Гаворым і паказваем».
19.40 Серыял «Ленінград 46».
21.20 Серыял «Мянтоўскія войны».
22.40 «Анатомія дня».
23.30 Серыял «Другі забойны».

8 КАНАЛ

7.00, 14.00, 19.35, 20.55, 23.25 «Надвор'е».
7.05, 16.00 Мультпарад.
7.30 «Тваё здароўе», «Нетрадыцыйная медыцына».
7.50, 19.40 Серыял «Чужаземка».
8.50, 13.45, 15.45, 16.40, 19.20 «Хатняя крама».
8.55 Серыял «Мерлін».
9.45 Драма «Жорсткая гульня».
11.35 Драма «Урокі французскай».
13.00 Дак. серыял «Кошак не любіць нельга».
14.05 Серыял «Міс Марпл Агаты Крысці».
16.20 «Золата маўчання».
16.50 Серыял «Дарагі доктар».
18.20 Серыял «Радзіма».
20.45 «Вечарніца».
21.00 Драма «Марыя Антуанета».
23.05 Серыял «Новыя прыгоды старой Крысцін».
23.30 «Хобі TV».

ВТБ

6.00, 4.00 «PLAY".
7.30 М/ф «Смяшарыкі».
8.00, 17.00, 0.30 Скетч-шоу «6 кадраў».
8.30 Серыял «Вароніны».
9.00 «Я падаю на развод».
10.00, 19.00 Серыял «Маладзёжка 2».
11.00, 18.00 Серыял «Два бацькі і два сыны».
12.00 Баявік «Куленепрабівальны».
14.00, 23.05 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
14.30, 17.30 «Лаві момант».
15.00 Серыял «Аднойчы ў міліцыі».
16.00, 3.00 «Давай развядзёмся!».
20.00 Серыял «Святлафор 5».
21.10 Меладрама «Крок наперад 2: вуліцы».
0.00 «Дурні і дарогі».
1.00 Серыял «Зачараваныя».

КУЛЬТУРА

7.00 «Еўраньюс».
10.00, 15.00, 19.00, 23.20 Навіны культуры.
10.15 «Наглядальнік».
11.15 «Волга-Волга». Маст. фільм.
13.00 «Ціха Браге». Дак. фільм.
13.10 «Лінія жыцця». Паліна Куцепава.
14.05, 1.40 «Пецярбургскія тайны». Серыял.
15.10 Пісьменнікі нашага дзяцінства. «Прыадчыненыя дзверы. Пісьменнік Л. Панцялееў».
15.45 «Восеньскі марафон». Маст. фільм.
17.20, 2.35 «Сусветныя скарбы культуры».
17.35 «Яхантаў». Дак. фільм.
18.15 Да 70-годдзя Вялікай Перамогі. «Выдатны полК». Дак. серыял «Ліля».
18.55 «Напісана вайной». Аляксей Пятрэнка чытае верш А. Твардоўскага «Я забіты пада Ржэвам».
19.15 Галоўная роля.
19.30 «Саці. Нясумная класіка...».
20.10 «Правілы жыцця».
20.40 «Гагарын». Дак. фільм.
21.35 «Тым часам».
22.20 Да юбілею Уладзіміра Васільева. «Маналог у 4-х частках». Частка 1-я.
22.50 Да 70-годдзя Вялікай Перамогі. «Рассакрэчаная гісторыя». Дак. серыял. «Падарунак Сталіну».
23.15 «Напісана вайной». Сяргей Бязрукаў чытае верш А. Таркоўскага «Калі вернемся дадому...».
23.40 «Бенджамін Брытан. Свет і канфлікт». Маст.-дак. фільм.
1.00 «Яхантаў». Дак. фільм.

НАСТАЛЬГІЯ

6.00 «Акулы пяра». Жэня Белавусаў.
6.55 М/ф «Казка пра страчаны час».
7.20 Фільм-канцэрт «Спявае К. Шульжэнка». 1964 год.
7.45, 13.45 «Ала Пугачова сустракае сяброў». 1994 год.
8.35, 19.20, 2.45 «Прэс-экспрэс». 1993 год.
8.45, 13.15, 18.55, 19.25, 20.45, 21.40, 23.00, 2.30, 3.40 Музычная настальгія.
9.00 «МузАбоз». 1991 год.
10.00, 16.00 Маст. фільм «Доўгія дні. Кароткія тыдні».
11.05, 17.05 Канцэрт «Вас запрашаюць касманаўты». 1984 год.
12.00 «Назад у СССР» з Уладзімірам Мукусевым. «Тэлемост». 2006 год.
13.30 Дак. фільм «Лас-Вегас днём і ноччу».
14.40 Фільм-канцэрт «Інтэрв'ю ў музыкі. Мікіта Багаслоўскі». 1986 год.
18.00 The Best of «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым. 2006 год.
19.50, 22.00 «Народжаныя ў СССР».
21.00, 3.00 «Мінулы час».
0.00 «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1957. 4-я частка.
0.50 Фільм-канцэрт «Спявае Эдзіта П'еха». 1964 год.
1.25 Маст. фільм «Джамайка». 2-я серыя.
4.00 «Колба часу».
5.00 Творчы вечар кампазітара Ігара Лучанка. 1990 год.

EUROSPORT

9.30, 10.45 Супербайк. Чэмпіянат свету.
10.15 Суперспорт. Чэмпіянат свету.
11.30 Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны.
12.00 Веласпорт. Парыж — Рубэ.
13.30 Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Фіналы.
15.00 Футбол. «Андэрлехт» (Бельгія) — «Шахцёр Данецк» (Украіна).
15.45 Футбол.
16.00, 20.45, 1.00 Футбол. Еўрагалы.
16.45, 23.30 Футбол. Фінал.
19.15, 1.45 Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны.
21.30 WATTS.
22.00 Пра рэслінг.

КАМЕДЫЯ

6.00, 10.00, 17.35, 3.10 Серыял «Кёрсці».
6.45 Камедыя «Зануда».
8.10, 14.25, 15.15, 19.55, 21.40, 0.50, 2.55, 5.30 Скетчком «Паміж намі».
8.25 Камедыя «Чалавек-эльф».
10.45 Камедыя «Купі, займі, выкрадзі».
12.25 Камедыя «Крама цудаў».
14.00, 14.50, 15.30 «Камедыянты (шоу)».
16.00 Камедыя «Прыгоды нянькі».
18.20 Камедыя «Дзённік кар'ерысткі».
20.20 Камедыя «Свята пад замком».
22.00 Серыял «Сваты». 1-я серыя.
23.10 Камедыя «Вясельная вечарынка».
1.15 Камедыя «Горка».
4.00 Камедыя «Трайныя непрыемнасці».

ТБЗ

6.00 М/ф.
8.00 «Доктар І..».
8.30, 18.50, 1.05 Серыял «Эзель».
10.15, 3.40 Дак. серыял «Па справах няпоўнагадовых».
12.00, 17.50 Дак. серыял «Справа Астахава».
13.00, 16.55 Дак. серыял «Сакрэты экстрасэнсаў».
13.55 Маст. фільм «Востраў».
16.00, 5.15 «Нераскрытыя тайны».
20.50 Серыял «Браты па абмене».
21.45, 0.20 Серыял «Мар'ін гай».
22.40 «Зорныя гісторыі».
23.35 Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».
2.45 «Часова даступны».

ТБ1000

6.45 Баявік «Патрыёт».
9.25 Драма «Валодаючы табой».
11.00, 4.40 Драма «Скарб».
12.45 Драма «Рамэа і Джульета».
14.45 Драма «Закаханыя».
16.20 Трылер «Стоўн».
18.00 Фэнтэзі «Цудоўныя стварэнні».
20.00 Драма «Месца пад соснамі».
22.15 Камедыя «Парыж — Манхэтэн».
23.50 Драма «Жорсткія гульні».
1.30 Камедыя «Вампіркі».
3.05 Жахі «Ідэнтыфікацыя».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.20 Прыгоды «Два капітаны».
7.55 Камедыя «Здрасьце, я ваш тата!».
9.20 Драма «Выгнанне».
11.55 Дэтэктыў «Памылка рэзідэнта».
14.15 Драма «Русалка».
16.00 Меладрама «Восеньскія клопаты».
17.30 Баявік «22 хвіліны».
18.55 Камедыя «Дазвольце цябе пацалаваць... на вяселлі».
20.30 Камедыя «Кур'ер з «Раю».
22.05 Баявік «Васьмёрка».
23.35 Драма «Чэмпіёны».
1.15 Камедыя «З Новым годам, мамы!».
2.45 Дэтэктыў «Сышчык Пуцілін. Касцюм Арлекіна».
4.25 Меладрама «Улетку я аддаю перавагу вяселлю».

NATIONAL GEOGRAPHIC

6.00, 12.30 Мегазаводы.
6.45, 13.15, 18.40, 22.30, 2.15 Навуковыя недарэчнасці.
7.10 Зрабі або памры.
7.55, 23.15 Расследаванні авіякатастроф.
9.25, 14.00, 19.30 Аўта-SOS.
11.40, 5.15 Шаша праз пекла.
15.35 Як змей марскі.
16.20 Сіла племя.
17.10, 0.00 Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
17.55 Забойства Іісуса.
21.00, 0.45, 3.45 Турэмныя цяжкасці.
21.45, 1.30, 4.30 Ліхтугі за мяжой.
3.00 Вялікія рэйды Другой сусветнай вайны.

DISCOVERY

8.00, 10.55, 15.55, 21.20 Як гэта зроблена?
8.25, 10.30, 15.30, 21.45 Як гэта ўстроена?
8.50, 11.20 Разбуральнікі легенд.
9.40, 13.50 Легендарны аўтамабіль.
12.10, 18.00 Паляўнічыя на склады.
13.00, 6.24 Голыя і напалоханыя.
14.40, 5.36 Што было далей?
16.20, 4.00 Геній аўтадызайну.
17.10, 4.48 Махінатары.
18.50 Хаос у дзеянні.
19.40 Жах у нябёсах.
20.30 А ты б выжыў?
23.00 Экстрэмальныя выхадныя.
23.50 Аляска: сям'я з лесу.
0.40, 3.10 Паляўнічыя на рэліквіі.
1.30, 7.12 Top Gear.
2.20 Маланкавыя катастрофы.
2.45 Сапраўдныя аферысты.

АЎТОРАК, 14 КРАСАВІКА

БЕЛАРУСЬ 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.55 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 19.40, 0.30 Зона Х.
9.10, 22.05 Серыял «След».
11.00, 13.00, 16.00 90 секунд.
11.05, 20.00 Да 70-годдзя Перамогі. Дэтэктыў «Ваенная разведка. Паўночны фронт».
12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-2».
13.05 Дзень у вялікім горадзе.
14.00 Серыял «Маша ў законе!».
15.15, 18.40 Навіны рэгіёна.
15.25, 1.00 Серыял «20 гадоў без кахання».
17.35 Беларуская часінка.
19.20, 0.10 Сфера інтарэсаў.
21.00 Панарама.
21.45 Спецыяльны рэпартаж.
0.45 Дзень спорту.

БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Тэлераніца.
9.00, 21.25 Тэлебарометр.
9.05, 16.40 Серыял «Асабістыя матывы».
10.05 «Fitnews».
10.40 Серыял «Косці».
12.40 Анімацыя для ўсёй сям'і. «Гарфілд».
13.55, 18.50 Серыял «Інтэрны».
15.40 «Comedy woman».
17.50, 1.15 Серыял «Віртуозы».
20.55 Мазгавы штурм.
21.30 Спортлато 6 з 49.
21.35 КЕНО.
21.40 Футбол. Ліга Чэмпіёнаў УЕФА. 1/4 фіналу. Першы матч. «Ювентус» — «Манака».
23.45 Серыял «Як я сустрэў вашу маму».
0.10 Серыял «Быць чалавекам».

БЕЛАРУСЬ 3

7.15 «Дабраранак».
7.50 «Хачу ўсё ведаць!».
8.00, 15.30, 19.30, 23.45 Калейдаскоп.
8.10, 17.55 «Гісторыя Тома Джонса Знайдыша». Драма. 1-я серыя.
9.45, 19.40 «Дзяржаўная мяжа». Фільм першы «Мы наш, мы новы...».
10.50, 17.25, 21.05 «Дыя@блог». «Пра літаратуру».
11.15 «Звычайны цуд». Музычны фільм. 1-я і 2-я серыі.
13.35 «Спакуса Дон Жуана». Драма.
15.00, 23.00 «Святло далёкай зоркі». Памяці кінарэжысёра Валерыя Басава.
15.40 «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
16.05 «Персона». Анастасія Мельнікава.
16.25 «Персона». Аляксандр Разенбаум.
16.40 «Гваздзік». Драма.
20.45 Калыханка.
21.30 «Баязет». Драма.
23.25 «Персона». Юрый Лаза.

БЕЛАРУСЬ 5

7.00, 2.20 PRO спорт. Навіны.
8.00 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
8.55 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Ліверпуль» — «Ньюкасл».
10.55 Хакей. КХЛ. Фінал. Другі матч.
12.50 Час футбола.
13.35 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. Першы тур. БАТЭ (Барысаў) — «Славія» (Мазыр).
15.25 Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. «Цмокі-Мінск» (Беларусь) — ЦСКА (Расія).
17.05 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. Першы тур. «Нёман» (Гродна) — «Дынама» (Мінск).
18.55 Спорт-кадр.
19.30 Змяшаныя адзінаборствы. ММА. М-1 Global.
21.35 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Чвэрцьфінал. Першы матч. «Атлетыка» (Мадрыд) — «Рэал» (Мадрыд).
23.35 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Чвэрцьфінал. Першы матч. «Ювентус» — «Манака».
1.25 Еўрапейскі покерны тур.

АНТ

6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), 20.30 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 «Жыць здорава!».
10.25 «Кантрольная закупка».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00 Навіны спорту.
11.10 «Фазэнда».
11.55 «Модны прыгавор».
13.10 «Мужчынскае/Жаночае».
14.10 «Сам-насам з усімі».
15.05, 16.15 «Час пакажа».
16.50 «Давай пажэнімся!».
18.20 Серыял «Татавы дочкі».
18.50 «Няхай гавораць».
20.00 Час.
21.05 Серыял «Фарца».
22.55 Серыял «Анёл або дэман».
23.50 «Вячэрні Ургант».
0.25 Начныя навіны.

СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
8.30 Меладрама «Маё вялікае грэчаскае лета».
10.10 «Далёкія сваякі».
10.40, 17.30 «Званая вячэра».
11.35 «Сямейныя драмы».
12.30 «Не хлусі мне!».
13.50 «Цэнтральны рэгіён».
14.20 «Мінск і мінчане».
14.50 «На 10 гадоў маладзейшыя».
15.35 «Мае цудоўныя...».
16.50 Серыял «Вовачка 4».
18.30, 1.50 Серыял «Мяжа часу».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 Маст. фільм «Мушкецёр».
22.05 «Глядзець усім!».
23.00 «Аўтапанарама».
23.20 «Дакументальны праект»: «Час гігантаў».
0.10 Серыял «Які памнажае смутак».

МІР

6.00 «180 хвілін».
9.00 «Агульны інтарэс».
9.30, 1.30 Маст. фільм «Двое пад адным парасонам».
11.15 Маст. фільм «Бумеранг».
13.00, 16.00, 19.00, 23.00 Навіны (бягучы радок).
13.20, 3.15 Дак. серыял «Дом без ахвяраў».
14.15, 4.10 Серыял «Джамайка».
16.25, 0.35 Ток-шоу «Слова за слова».
17.20 Серыял «Участковы дэтэктыў».
19.25 Маст. фільм «Мужчынская жаночая гульня».
21.10, 23.15 Серыял «Двое з куфра-2».
0.25 Навіны (бягучы радок). Гарачая тэма.

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Раніца Расіі».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 Маст. фільм «Трава зялёная».
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.30 Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
15.30 «Прамы эфір».
17.10 Серыял «Апошні янычар».
18.00 «Асаблівы выпадак».
18.55 «Дзеці індыга».
20.55 Серыял «Кветкі чарамхі».
21.55, 23.10 Серыял «Скліфасоўскі».
23.55 «Шыфры нашага цела. Невядомыя органы». Фільм 2-і.

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.00 «Кава з малаком».
9.05 «Справа ўрачоў».
10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара. Новыя серыі».
12.00 «Суд прысяжных».
13.15 «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
14.15 «Справа густу».
14.45, 22.15 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
15.10 «Усё будзе добра!».
16.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».
18.00 Ток-шоу «Гаворым і паказваем».
19.40 Серыял «Ленінград 46».
21.20 Серыял «Мянтоўскія войны».
22.40 «Анатомія дня».
23.30 Серыял «Другі забойны».

8 КАНАЛ

7.00, 14.00, 19.40, 21.05, 23.30 «Надвор'е».
7.05, 16.00 Мультпарад.
7.30, 19.45 Серыял «Чужаземка».
8.30, 18.20 Серыял «Радзіма».
9.25, 13.45, 15.45, 16.40, 19.25, 21.00 «Хатняя крама».
9.45 Серыял «Мерлін».
10.30, 23.35 «Хобі TV».
11.00 Драма «Хаціка — самы лепшы сябар».
12.40 Дак. серыял «Кошак не любіць нельга».
13.30 «Кінаблакнот».
14.05 Серыял «Міс Марпл Агаты Крысці».
16.30 «Золата маўчання».
16.50 Серыял «Дарагі доктар».
20.50 «Вечарніца».
21.10 «Даведнік па краінах і кантынентах».
21.20 Драма «Я пачатак».
23.10 Серыял «Новыя прыгоды старой Крысцін».

НОВЫЯ ПРЭМ'ЕРЫ НА АНТ

11 красавіка адбудзецца прэм'ера праграмы «Бараholка». Яна збярэ ля экранаў усіх тых, хто любіць і цэніць старажытныя рэчы, калекцыяніруе іх, і проста цікавіцца гісторыяй і мастацтвам.

Як абяцаюць стваральнікі, «Бараholка» — тая праграма, у якой уладальнікі добрага густу і вострага погляду змогуць знайсці на блышыным кірмашы сапраўдныя творы мастацтва. У кожным выпуску будуць прымаць удзел людзі, якія цікавяцца антыкварыятам і старажытнымі рэчамі. А дапамагаць ім у гэтым будуць вядомыя артысты, мастакі і пісьменнікі. Прадзюсарам і вядучым новай праграмы стаў Андрэй Малахаў.

— Упершыню вырашыў паспрабаваць сябе ў якасці прадзюсара. «Бараholка» будзе расказваць гісторыі рэчаў, што захоўваюцца ў нашых шафах, на гарышчах, складах і антрэсолях. Нам можа здавацца, быццам рэчы маюць вялікую каштоўнасць, але часта мы не разумеем, колькі яны каштуюць і ці наогул маюць цану, — расказвае Андрэй Малахаў. — Мы імкнуліся знайсці герояў з цікавымі гісторыямі, звязанымі з сямейнымі рэліквіямі, што захоўваюцца ў іх дома. А потым, паказаўшы іх экспертам, будзем ацэньваць іх. Усё гэта аб'яднана з гульнёй, у якой нашы ўдзельнікі за 15 хвілін на блышыным кірмашы за пэўную суму грошай паспрабуюць знайсці цікавыя і каштоўныя рэчы.

Галоўны прыз атрымаюць тыя гульцы, якім удасца за вызначаны час знайсці самыя дарагія і каштоўныя прадметы мастацтва. Пераможцы адправяцца з вядучым на блышыны кірмаш у Парыж. А пакуль гісторыя толькі пачынаецца, назірайце за яе развіццём па суботах у эфіры тэлеканала АНТ.

Таксама з 11 красавіка распачнецца паказ «Акадэміі талентаў. Чацвёрты курс». Праект ужо не першы год з'яўляецца пляцоўкай, на якой сутыкаюцца інтарэсы і амбіцыі трох музычных прадзюсараў — Дзмітрыя Фаміча, Паўла Клышэўскага і Яны Станкевіч. А гледачоў чакае захапляльны праект, дзе на працягу 12 тыдняў будуць шліфавацца галасы новых артыстаў.

У першых чатырох праграмах прадзюсары будуць праслухоўваць канкурсантаў і фарміраваць свае каманды, у кожную з якіх трапіць толькі па 9 чалавек. Прыхільнікі праекта змогуць убачыць, як на гэты раз праходзіў адбор і чым удзельнікі спрабавалі здзівіць суддзяў.

Тых, хто адваюе сабе пуцёўку на праект, канкурэнцыя чакае сур'ёзная. А хто з фіналістаў атрымае шанц падпісаць кантракт з вядомым беларускім прадзюсарам і грашовы прыз 100 мільёнаў рублёў, вызначаць самі тэлегледачы ў ходзе інтэрактыўнага галасавання. Вядучымі праекта будуць Ганна Шаркунова і Андрэй Бонд.

А вось з 12 красавіка кожную нядзелю гледачоў АНТ запрашае да экранаў праграма «Горка!».

Вяселле — для кожнай пары свята асаблівае. Таму стваральнікі праграмы пабывалі на вяселлях у розных месцах краіны і пакажуць, як адзначаюць гэтае свята. А потым выберуць пару, якая адправіцца ў вясельнае падарожжа. І госці змогуць паказаць сябе. Правілы гульні простыя — напярэдадні альбо ў дзень вяселля яны атрымліваюць пяць заданняў, якія трэба выканаць. Каму і якое заданне дастанецца — трымаецца ў сакрэце да канца свята. А сюрпрызам для маладых будзе запрошаная «зорка», якая не толькі павіншуе жаніха і нявесту, але і ацэніць, як справіліся госці з заданнямі. Глядзіце прэм'еру 12 красавіка.

Алена ДРАПКО.

ВТБ

6.00, 4.00 «PLAY».
7.30 М/ф «Смяшарыкі».
8.00, 17.00, 0.30 Скетч-шоу «6 кадраў».
8.30 Серыял «Вароніны».
9.00, 20.00 Серыял «Святлафор 5».
10.00, 19.00 Серыял «Маладзёжка 2».
11.00, 18.00 Серыял «Два бацькі і два сыны».
12.00 Меладрама «Крок наперад 2: вуліцы».
14.00, 23.10, 2.30 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
14.30, 17.30 «Лаві момант».
15.00 Серыял «Аднойчы ў міліцыі».
16.00, 3.00 «Давай развядзёмся!».
21.10 Меладрама «Крок наперад 3D».
0.00 «Дурні і дарогі».
1.00 Серыял «Зачараваныя».

КУЛЬТУРА

6.30 «Еўраньюс».
10.00, 15.00, 19.00, 23.20 Навіны культуры.
10.15 «Наглядальнік».
11.15, 23.40 Знакамітыя кінадуэты. Марыс Шэвалье і Наталі Палей. «Чалавек з «Фолі-Бержэр». Маст. фільм.
12.40 «Андрэіч». Дак. фільм.
13.10, 20.10 «Правілы жыцця».
13.35 «Пятае вымярэнне».
14.05, 1.55 «Пецярбургскія тайны». Серыял.
15.10 Пісьменнікі нашага дзяцінства. «Віталь Біянкі. Рэдактар «Лясной газеты».
15.40 «Саці. Нясумная класіка...».
16.20 85 гадоў з дня нараджэння Вітаўтаса Жалакявічуса. «Астравы».
17.05 Мікалай Пятроў, Аляксандр Гіндзін, Ізраільскі камерны аркестр і квартэт імя А. Барадзіна. Канцэрт у Аружэйнай палаце.
18.00, 1.40 «Сусветныя скарбы культуры».
18.15 Да 70-годдзя Вялікай Перамогі. «Выдатны полК». Дак. серыял. «Натка».
18.55 «Напісана вайной». Армен Джыгарханян чытае верш Г. Пажаняна «Пагоня».
19.15 Галоўная роля.
19.30 Штучны адбор.
20.40 «Добрай ночы, малыя!».
20.50 100 гадоў з дня нараджэння Пятра Глебава. «Астравы».
21.35 «Гульня ў бісер». «Л. Кэрал. «Аліса ў Краіне Цудаў».
22.20 Да юбілею Уладзіміра Васільева. «Маналог у 4-х частках».
22.50 Да 70-годдзя Вялікай Перамогі. «Рассакрэчаная гісторыя». Дак. серыял. «Каты Хатыні».
23.15 «Напісана вайной». Аляксей Баталаў чытае верш М. Ісакоўскага «Ворагі спалілі родную хату».
1.05 Канцэрт Сімфанічнага аркестра Гевандхауса.
2.50 «Стэндаль». Дак. фільм.

НАСТАЛЬГІЯ

6.05 «Назад у СССР» з Уладзімірам Мукусевым. «Тэлемост». 2006 год.
7.20, 12.55, 13.25, 14.45, 15.40, 17.00, 18.35, 19.05, 20.25, 21.40, 23.00, 2.45 Музычная настальгія.
7.30 Дак. фільм «Лас-Вегас днём і ноччу».
7.45, 1.45 «Ала Пугачова сустракае сяброў». 1994 год.
8.40 Фільм-канцэрт «Інтэрв'ю ў музыкі. Мікіта Багаслоўскі». 1986 год.
10.00, 4.00 Маст. фільм «Доўгія дні. Кароткія тыдні».
11.05, 5.05 Канцэрт «Вас запрашаюць касманаўты». 1984 год.
12.00 The Best of «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым. 2006 год.
13.20, 19.00, 2.35 «Прэс-экспрэс». 1993 год.
13.50, 16.00, 22.00 «Народжаныя ў СССР».
15.00, 21.00 «Мінулы час».
18.00 «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім. 2005 год.
19.40 «Бітламанія» з Д. Дзібровым. 2008 год.
0.00 «Акулы пяра». Жэня Белавусаў.
0.55 М/ф «Казка пра страчаны час».
1.20 Фільм-канцэрт «Спявае К. Шульжэнка». 1964 год.
3.00 «МузАбоз». 1991 год.

EUROSPORT

9.30, 12.30, 18.15 Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны.
10.30, 15.00 Футбол. Еўрагалы.
11.15 Футбол.
11.30, 15.45 Футбол. Фінал.
13.30 Снукер. Мастэрс. Фінал.
17.00 Веласпорт. Парыж — Рубэ.
19.00, 1.30 Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны.
20.45 WATTS.
21.30 Бокс. Тытул МБФ.
23.30 Аўтагонкі. Чэмпіянат свету па эндуранс. Агляд.
0.00 Аўтагонкі.
0.30 Аўтагонкі. Серыя Blancpain Endurance.

КАМЕДЫЯ

6.00, 10.00, 1.15 Серыял «Кёрсці».
6.45 Камедыя «Чалавек-эльф».
8.10, 14.25, 15.15, 0.35 Скетчком «Паміж намі».
8.25 Камедыя «Крама цудаў».
10.45 Камедыя «Прыгоды нянькі».
12.30 Камедыя «Дзённік кар'ерысткі».
14.00, 14.50, 15.30 «Камедыянты (шоу)».
16.00 Камедыя «Вясельная вечарынка».
17.35, 22.00 Серыял «Сваты».
18.50 Камедыя «Свята пад замком».
20.20 Камедыя «Уцёкі».
23.10 Камедыя «Няўдачлівыя».
2.00 Прафілактыка.

ТБ3

6.00 М/ф.
7.25 «Доктар І..».
7.55, 18.50, 2.00 Серыял «Эзель».
9.40, 3.55 Дак. серыял «Па справах няпоўнагадовых».
11.25, 17.50 Дак. серыял «Справа Астахава».
12.20, 16.55 Дак. серыял «Сакрэты экстрасэнсаў».
13.10, 21.00 Серыял «Браты па абмене».
14.00 «Простыя складанасці».
14.30, 1.15 Серыял «Управа».
15.30, 22.50 «Зорныя гісторыі».
16.25, 5.30 «Нераскрытыя тайны».
21.55, 0.30 Серыял «Мар'ін гай».
23.45 Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».

ТБ1000

6.40, 13.25 Драма «Жорсткія гульні».
8.25 Драма «Простыя ісціны».
9.55 Драма «Калі я памірала».
11.50 Жахі «Ідэнтыфікацыя».
15.00 Камедыя «Шэф».
16.30 Драма «Мушкецёры».
18.25 Драма «Гайд-парк на Гудзоне».
20.00 Драма «Змоўшчыца».
22.10 Камедыя «Дагары нагамі».
23.45 Драма «Знайсці Форэстэра».
2.00 Камедыя «Ну што, прыехалі?».
3.45 Драма «Гавана, я люблю цябе».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.00 Камедыя «Набожная Марта».
8.20 Фантастыка «Кантакт».
10.00 Камедыя «З Новым годам, мамы!».
11.25 Дэтэктыў «Лёс рэзідэнта».
14.05 Камедыя «Заяц над безданню».
15.45 Баявік «Васьмёрка».
17.10 Камедыя «Дзед 005».
18.45 Камедыя «Дазвольце цябе пацалаваць... бацька нявесты».
20.20 Баявік «Салавей-разбойнік».
22.00 Камедыя «Здрасьце, я ваш тата!».
23.30 Драма «Выгнанне».
2.10 Дэтэктыў «Сышчык Пуцілін. Князь ветру».
4.25 Дэтэктыў «Забойства на 100 мільёнаў».

NATIONAL GEOGRAPHIC

6.00, 12.30 Мегазаводы.
6.45, 13.15, 18.40, 22.30, 2.15 Навуковыя недарэчнасці.
7.10 Зрабі або памры.
7.55, 10.55 Аўта-SOS.
9.25, 14.00, 19.30 Падарожжа да ядра Зямлі.
11.40, 5.15 Шаша праз пекла.
15.35 Тайны гуансійскіх пячор.
16.20 Сіла племя.
17.10, 0.00 Супербудаванні Трэцяга рэйха.
17.55 Забойства Ісуса.
21.00, 0.45, 3.45 Гульні розуму.
21.45, 1.30, 4.30 Узлом сістэмы.
23.15 Расследаванні авіякатастроф.

DISCOVERY

8.00, 10.55, 15.55, 21.20 Як гэта зроблена?
8.25, 10.30, 15.30, 21.45 Як гэта ўстроена?
8.50, 11.20 Што было далей?
9.40, 13.50, 22.10 Геній аўтадызайну.
12.10, 18.00 Паляўнічыя на рэліквіі.
13.00, 6.24 Выжыванне без купюр.
14.40, 5.36 Скрыўленне часу.
16.20, 4.00 Майстэрня «Фантом Уоркс».
17.10, 23.00, 4.48 Махінатары.
18.50 Аляска: сям'я з лесу.
19.40 Экстрэмальныя выхадныя.
23.50 Вулічныя гонкі.
0.40, 3.10 Бітвы за кантэйнеры.
1.30, 7.12 Top Gear.
2.20 Маланкавыя катастрофы.
2.45 Сапраўдныя аферысты.

СЕРАДА, 15 КРАСАВІКА

БЕЛАРУСЬ 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 15.00, 19.00, 0.35 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 19.40, 23.55 Зона Х.
9.05 Тэхнічная прафілактыка.
15.15, 18.40 Навіны рэгіёна.
15.25, 1.05 Серыял «20 гадоў без кахання».
16.00 90 секунд.
16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-2».
17.35 Беларуская часінка.
19.20, 0.15 Сфера інтарэсаў.
20.00 Да 70-годдзя Перамогі. Дэтэктыў «Ваенная разведка. Паўночны фронт».
21.00 Панарама.
21.45 Актуальнае інтэрв'ю.
22.05 Серыял «След».
0.50 Дзень спорту.

БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Тэлераніца.
9.00, 21.25 Тэлебарометр.
9.05 Тэхнічная прафілактыка.
15.00 Ікра.
15.30, 18.50 Серыял «Інтэрны».

17.50 Серыял «Віртуозы».
20.55 Мазгавы штурм.
21.30 Спортлато 5 з 36.
21.35 КЕНО.
21.40 Футбол. Ліга Чэмпіёнаў УЕФА. 1/4 фіналу. Першы матч. «Порту» — «Баварыя».
23.45 Футбол. Ліга Чэмпіёнаў УЕФА. 1/4 фіналу. Першыя матчы. Агляд.
0.15 Рэпарцёр.
1.00 Серыял «Як я сустрэў вашу маму».

БЕЛАРУСЬ 3

7.15 Тэхнічная прафілактыка.
5.05, 19.30, 23.45 Калейдаскоп.
15.15 «Дзяржаўная мяжа». Фільм першы «Мы наш, мы новы...» 2-я серыя.
16.20 «Навукаманія». У клубе касмічных дзяржаў.
16.45 «Персона». Дзіяна Арбеніна.
17.00 «Персона». Раман Вікцюк.
17.25 «Гваздзік». Драма.
18.10, 21.05 «Дыя@блог». «Пра прыгожае».
18.35 «Гісторыя Тома Джонса Знайдыша». Драма. 2-я серыя.
19.40 «Дзяржаўная мяжа». Фільм другі «Мірнае лета 21-га». 1-я серыя.
20.45 Калыханка.
21.30 «Баязет». Драма.
23.00 «Святло далёкай зоркі». Памяці паэта-песенніка Міхаіла Ясеня.
23.25 «Персона». Іван Краско.

БЕЛАРУСЬ 5

3.05, 17.20 Баскетбол. НБА. «Індыяна» — «Вашынгтон».
5.25 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Чвэрцьфінал. Першы матч. «Атлетыка» (Мадрыд) — «Рэал» (Мадрыд).
7.30, 1.15 PRO спорт. Навіны.
8.30 Спорт-кадр.
9.00 Тэхнічная прафілактыка.
15.00 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Чвэрцьфінал. Першы матч. «Ювентус» — «Манака».
17.05 Козел пра футбол.
19.25 Футбол. Кубак Беларусі. Паўфінал. Першы матч. БАТЭ (Барысаў) — «Дынама» (Мінск).
21.35 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Чвэрцьфінал. Першы матч. ПСЖ — «Барселона».
23.35 Баскетбол. Адзіная Ліга ВТБ. «Зеніт» (Санкт-Пецярбург) — «Цмокі-Мінск».

АНТ

6.00, 8.30, 9.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 Тэхнічная прафілактыка.
15.00, 16.15 «Час пакажа».
16.10, 18.15, 21.00 Навіны спорту.
16.50 «Давай пажэнімся!».
18.20 Серыял «Татавы дочкі».
18.50 «Няхай гавораць».
20.00 Час.
21.05 Серыял «Фарца».
23.05 Серыял «Анёл або дэман».
0.00 «Вячэрні Ургант».
0.35 Начныя навіны.

СТБ

6.00, 7.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Мінскчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
8.25, 17.30 «Званая вячэра».
9.00 — 15.00 Прафілактыка.
15.00 Серыял «Які памнажае смутак».
16.50 Серыял «Вовачка 4».
18.30, 1.50 Серыял «Мяжа часу».
